А.Р. Агееў



# ТРАДЫЦЫЙНАЯ КУЛЬТУРА НАРОДАЎ АМЕРЫКІ

Метадычныя рэкамендацыі
для студэнтаў 1 курса гістарычнага факультэта

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Магілёў 2008

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Установа адукацыі
"МАГІЛЁЎСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ
імя А.А. КУЛЯШОВА"

А.Р. Агееў

# ТРАДЫЦЫЙНАЯ КУЛЬТУРА НАРОДАЎ АМЕРЫКІ

Метадычныя рэкамендацыі
для студэнтаў 1 курса гістарычнага факультэта

Магілёў 2008

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

УДК 39(7/8)(075.8)
ББК 63.5(3)
A23

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета
МДУ імя А.А. Куляшова

**Рэцэнзенты:**
кандыдат гістарычных навук дацэнт кафедры грамадскіх дысцыплін
УА "Магілёўскі дзяржаўны універсітэт харчавання"
*І.А. Пушкін;*

кандыдат гістарычных навук
прафесар кафедры гісторыі і культуры Беларусі
УА "Магілёўскі дзяржаўны універсітэт імя А.А. Куляшова"
*П.Ф. Дзмітрачкоў*

**Агееў, А.Р.**
A23 Традыцыйная культура народаў Амерыкі: метад. рэкамендацыі для студэнтаў 1 курса гістарычнага факультэта. – Магілёў: МДУ імя А.А. Куляшова, 2008. – 36 с.

Метадычныя рэкамендацыі для студэнтаў 1 курса гістарычнага факультэта раскрываюць асаблівасці матэрыялу тэмы "Этнічныя супольнасці Амерыкі" курса "Этналогія". Яны прызначаны аблегчыць засваенне імі вучэбнага матэрыялу на занятках і ў працэсе самастойнай работы, аблегчыць арганізацыю вучэбнага працэсу.

**УДК 39(7/8)(075.8)**
**ББК 63.5(3)**

© Агееў А.Р., 2008
© Афармленне. УА "МДУ імя А.А. Куляшова", 2008

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# ПРАДМОВА

“Традыцыйная культура народаў Амерыкі” з'яўляецца адной з тэм курса “Асновы этналогіі” – адной з тых дапаможных вучэбных спецыяльных дысцыплін, якія вызначаюць прафесійную падрыхтоўку гісторыка ў адпаведнасці з патрабаваннямі кваліфікацыйных характарыстык спецыяльнасцей 1-21 03 01; 1-21 03 01-01; П.02.01.03. Праграмны матэрыял вывучаюць студэнты першага года навучання. Змест курса ў адпаведнасці з праграмай размеркаваны па тэмах лекцыйных і семінарскіх заняткаў, частка матэрыялу вылучана для самастойнага вывучэння.

Галоўнай мэтай курса з'яўляецца азнаямленне студэнтаў з этнічнай гісторыяй чалавецтва і культурай асноўных этнічных супольнасцяў розных рэгіёнаў планеты пры дапамозе параўнальна-гістарычнага і гісторыка-генетычнага метадаў. Адначасова ставяцца задачы фарміравання цэласных трывалых ведаў па этналогіі; абагульнення разнастайных гістарычных ведаў па этнічных праблемах; развіцця ў студэнтаў этналагічнага мыслення і ўмення самастойна аналізаваць і параўноўваць матэрыял; выхавання ў студэнтаў паважлівых адносін да іншых культур і народаў.

Традыцыйная культура народаў Амерыкі па плане вывучаецца пасля праходжання традыцыйнай культуры народаў Аўстраліі і Акіяніі і з'яўляецца другой тэмай сярод тэм курса, у якіх раскрываецца этнічная культура аднаго з рэгіёнаў нашай планеты. Яна вывучаецца студэнтамі як на лекцыях, так і самастойна. Важнасць гэтай тэмы вызначаецца не толькі неабходнасцю засваення праграмнага матэрыялу, але і тым, што этнічная карта і гісторыя Амерыкі надзвычай цікавая і павучальная.

Слабая заселенасць і адарванасць Новага свету ад Старога дазваляе параўноўваць уздзеянне прыродна-кліматычнага асяроддзя на гістарычныя працэсы, вылучаць агульныя для ўсяго чалавецтва заканамернасці. Амерыка цікавіла этнолагаў і сваімі вельмі архаічнымі формамі гаспадаркі і культуры, якія да нядаўняга часу яшчэ добра захоўваліся ў асобных рэгіёнах. Аддаленасць ад іншых этнасаў свету тармазіла развіццё амерыканскіх народаў. У выніку яшчэ ў канцы XVIII ст. некаторыя народы не ведалі земляробства і жывёлагадоўлі.

Гаспадарчыя ўклады абарыгенаў Амерыкі надзвычай разнастайныя. Тут жылі да прыходу еўрапейцаў марскія паляўнічыя і рыбаловы, паляўнічыя і збіральнікі лясной зоны, збіральнікі жалудоў, аселыя земляробы, конныя паляўнічыя, а таксама гэтая частка свету нарадзіла высокаразвітыя земляробчыя цывілізацыі майя, ацтэкаў і інкаў.

Паслядоўнае вывучэнне культуры абарыгенаў Амерыкі дазваляе ўбачыць эвалюцыю матэрыяльнай і духоўнай культуры народаў свету і іх асобных кампанентаў (састаўляючых). На базе атрыманых пад час вывучэння гэтай тэмы ведаў значна лягчэй ідзе засваенне студэнтамі матэрыялаў наступных тэм вучэбнага курса.

Метадычныя рэкамендацыі ўтрымліваюць скарочаны тэкст лекцыі, пытанні для самакантролю, тэматыку рэфератаў, слоўнік неабходных для вывучэння тэмы тэрмінаў і асноўную літаратуру па тэме. Матэрыял лекцыі выкладаецца ў адпаведнасці з традыцыйна прынятым падзелам гэтага рэгіёна планеты на гісторыка-культурныя вобласці.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# ГЕАГРАФІЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА І ГІСТОРЫЯ ЗАСЯЛЕННЯ АМЕРЫКІ

## Геаграфічная характарыстыка

Амерыка – частка свету ў Заходнім паўшар'і паміж Атлантычным і Ціхім акіянамі агульнай плошчай 42,5 млн км². Яна выцягнулася з поўначы на поўдзень, і яе ўтвараюць два мацерыкі – Паўночная і Паўднёвая Амерыка. Уздоўж ціхаакіянскага ўзбярэжжа цягнецца вялікая горная краіна Кардыльеры – Анды. На ўсход ад горных масіваў на абодвух кантынентах знаходзяцца вялікія раўніны.

## Праблема першапачатковага засялення Амерыкі

Навуковымі даследаваннямі даказана, што продкі індзейцаў – групы сібірскіх плямёнаў – пачалі перасяляцца з Паўночна-Усходняй Азіі ў Амерыку праз пярэсмык (зараз Берынгаў праліў) у эпоху верхняга палеаліту 30–20 тыс. гадоў назад. Рассяленне індзейцаў па абодвум кантынентам і асваенне імі новых зямель ва ўмовах неспрыяльнага ў многіх абласцях клімату і прыроднага асяроддзя цягнулася многія тысячагоддзі.

Дыскусія аб прарадзіме індзейцаў працягваецца з моманту адкрыцця Амерыкі. Сібірская версія заўсёды была самай папулярнай. Але ёсць і іншыя гіпотэзы. Даказана, што з 1000 па прыкладна 1350 г. вікінгі, якія мелі сталыя пасяленні на Грэнландыі, наведвалі Паўночную Амерыку. Магчыма, у перыяд з 6 тыс. да н.э. да 1,5 тыс. да н.э. на гэты кантынент перасяліліся выхадцы з Інданезіі, аб чым сведчыць дзіўнае падабенства прылад працы, зброі і г.д. Група вучоных назапасіла вялікую колькасць фактычнага матэрыялу, якая даказвае магчымасць перасялення 7 тыс. гадоў назад продкаў сучасных айнаў (Японія, Курылы) у сучасны Эквадор. У раёнах Перу і Чылі маглі высадзіцца і палінезійцы. Ёсць факты, якія сведчаць аб магчымасці перасялення фінікійцаў або афрыканцаў у Цэнтральную Амерыку.

У апошнія гады вучоныя мічыганскага універсітэта пацвердзілі старую гіпотэзу аб засяленні Амерыкі з Сібіры. Яны правялі маштабныя даследаванні генных кодаў 29 індзейскіх плямёнаў Паўночнай, Цэнтральнай і Паўднёвай Амерыкі і двух груп сібірскіх абарыгенаў. Згодна атрыманым генетычным дадзеным, якія яны апублікавалі ў 2007 г., продкі сучасных індзейцаў і эскімосаў прайшлі па "Берынгійскаму мосту", які знік недзе 12 тыс. гадоў да н.э., у прамежку часу паміж 70 і 12 тыс. гадоў назад некалькімі хвалямі. Аналіз пацвердзіў, што сібірскія народы з'яўляюцца прамымі продкамі індзейцаў.

Узровень культуры першых перасяленцаў адпавядаў верхнепалеалітычнай і мезалітычнай культурам Старога Свету. Да прыходу еўрапейцаў большасць амерыканскіх этнасаў прайшла ў сваім развіцці доўгі шлях і знаходзілася на



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

розных стадыях развіцця радавога ладу. У адных панаваў мацярынскі род (іракезы, многія плямёны паўднёвай Амерыкі), у большасці – бацькоўскі. Частка народаў пераходзіла ад радавога да класавага грамадства. Майя, ацтэкі, інкі стварылі развітыя цывілізацыі.

Моўная класіфікацыя амерыканскіх народаў з'яўляецца складанай навуковай праблемай. Таму ў этналогіі прынята класіфікаваць народы гэтай часткі свету не па моўным, а па гісторыка-гаспадарчам прынцыпе ці "культурным арэалам". На тэрыторыі Амерыкі да прыходу еўрапейцаў існавала некалькі гаспадарчых тыпаў і **гісторыка-культурных абласцей**:

Арктычная вобласць марскога палявання і рыбалоўства (эскімосы і алеуты).

Паўночна-заходняе ўзбярэжжа Паўночнай Амерыкі – вобласць рыбалоўства і марскога палявання.

Поўнач Канады і ўнутраная Аляска – вобласць паляўнічых і збіральнікаў лясной зоны.

У Каліфорніі – вобласць збіральнікаў жалудоў, паляўнічых і рыбаловаў.

Усход ЗША – вобласць аселых земляробаў.

У прэрыях ЗША пасля пачатку Еўрапейскай каланізацыі склалася культура конных паляўнічых на бізонаў.

Паўднёвы захад ЗША – вобласць развітага земляробства, а пазней жывёлагадоўлі.

Земляробчыя цывілізацыі майя, ацтэкаў і інкаў.

Трапічная зона Паўднёвай Амерыкі – вобласць матычнага земляробства, паляўнічых і збіральнікаў.

Вобласць аргентынскай пампы і Патагоніі, дзе склалася культура конных паляўнічых.

Поўдзень Амерыкі – вобласць прымітыўных рыбаловаў, паляўнічых і збіральнікаў.

**Пытанні для самакантролю:**

Калі з'явіліся на тэрыторыі Амерыкі першыя людзі і якія існуюць версіі яе засялення?

На якія гісторыка-культурныя вобласці можна падзяліць тэрыторыю Амерыкі да прыходу еўрапейцаў?

## АРКТЫЧНЫЯ ПАЛЯЎНІЧЫЯ І РЫБАЛОВЫ

На поўначы Амерыкі пражываюць арктычныя паляўнічыя і рыбаловы – эскімосы і алеуты. Яны прадстаўнікі апошняй да прыходу еўрапейцаў хвалі перасяленцаў з Азіі ў Амерыку.

**Эскімосы** – этнічная супольнасць, якая рассялілася ад усходняй Чукоткі Расійскай Федэрацыі і Аляскі ўздоўж арктычнага ўзбярэжжа Канады да Грэнландыі. Жывуць яны на ўзбярэжжы мора ва ўмовах арктычнай тундры

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

і паўпустыні. Эскімосы сфарміраваліся як этнас у раёне Берынгава мора да канца II тыс. да н.э. і сталі сяліцца на арктычным узбярэжжы на ўсход дасягнуўшы Грэнландыі яшчэ да нашай эры. **Алеуты** засялілі Алеуцкі архіпелаг у Ціхім акіяне.

### Антрапалагічная і лінгвістычная характарыстыка

Антрапалагічна эскімосы і алеуты адносяцца да арктычнага тыпу мангалоідаў. Яны адрозніваюцца ад астатніх народаў Амерыкі, затое дужа падобныя на чукчаў і каракаў Усходняй Сібіры.

Гавораць арктычныя зверабоі на мовах эскімоса-алеўцкай сям'і. Слова "эскімос" ("сыраед", "той, хто есці сырую рыбу") прыналежыць мове індзейцаў Атабаскаў. З цягам часу яно стала назвай усяго народу.

### Гаспадарчая дзейнасць і матэрыяльная культура эскімосаў

Эскімосы адносяцца да культур **марскіх арктычных зверабояў**. Яны адважныя рыбаловы і смелыя паляўнічыя, якія таленавіта выкарыстоўвалі суровыя ўмовы крайняй Поўначы і здаўна жылі за кошт марскога палявання на кітоў, маржоў, цюленяў, нерпаў і сухапутнага палявання на аленяў **карыбу**, птушак. Здабыча выкарыстоўвалася амаль цалкам: мяса ішло на ежу, на яе ж і на ацяпленне ішоў тлушч, скуры – на адзенне, выраб лодак і абсталяванне жылля, з касцей выраблялі прылады працы і мэблю і г.д. У залежнасці ад колькасці марскіх жывёл паляўнічыя маглі хутка пераарыентавацца з аднаго віду лову на іншы. Збіральніцтва магчыма толькі летам і мае дапаможны характар.

Эскімосы здолелі стварыць формы культуры, выдатна прыстасаваныя да жыцця ў Арктыцы: гарпуны з паваротным наканечнікам, паляўнічую лодку-**каяк**, глухое футравае адзенне, паўземлянку і купалападобнае жытло **Іглу** з снегу, тлушчавыя лямпы для варкі ежы, асвятлення і абагрэву жылля і г.д. На працягу іх пражывання ў Арктыцы клімат рэгіёна некалькі разоў мяняўся. Пацяпленні змяняліся пахаладаннямі. Але гэта не прыводзіла да пагібелі эскімоскай культуры. У іх існавала некалькі варыянтаў культурных традыцый. Калі не спрацоўвалі адны, то прымяняліся іншыя варыянты. Падобная гібкасць мыслення ўласціва адкрытаму грамадству, з'яўлялася неабходнай умовай выжывання у рызыкоўных умовах пражывання. Да таго ж яна выгадна эканамічна.

Эскімосы выкарыстоўвалі каменныя і касцяныя прылады працы. Так, з маржовага клыка ці рагоў аленя выраблялiся гарпуны з паваротным наканечнікам. Іх канструкцыя, якая практычна засталася нязменнай і сёння, – выдатнае інжынернае прыстасаванне, заснаванае на інтуітыўным веданні законаў механікі і аэрадынамікі. Праўда, цяпер гарпуны металічныя, пераважна бронзавыя, каб не іржавелі ў вадзе. Да гарпуна прывязвалі на доўгім рэмні



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

пузыр, каб здабытая жывёла не патанула, а канец рэмня прымацоўвалі да лодкі. Эскімосы выкарыстоўвалі на паляванні таксама лук і стрэлы.

Асноўным сродкам руху па снезе служылі ступацельныя лыжы, а транспартным сродкам – сабачыя нарты. Яны выраблялі ўстойлівыя герметычныя лодкі-каякі (байдаркі) і моцныя вёслы, з дапамогай якіх рухаліся па адкрытай вадзе мужчыны-паляўнічыя. Існавалі і вялікія лодкі для перавозкі грузаў, на якіх звычайна хадзілі на вёслах жанчыны.

**Адзенне** эскімосаў – таксама прыклад адаптацыі. Аснова яго – нагавіцы і кашуля з капюшонам з футра аленя. Зімой адзенне было двухслойным. Ніжні камплект апранаўся мехам унутр, а знешні – наверх.

**Жыллё**. Летам эскімосы сяліліся невялікімі групамі ў конусападобным жыллі тыпу **чума**, якое пакрывалася скурамі. Зімой жылі некалькімі сем'ямі ў паўземлянках, або ў **іглу** (эск. igdlu), якія будаваліся са снегу купалападобнай формы з уваходам праз доўгі калідор, а ўнутры сцены закрываліся скурамі. Жытло ацяплялася спецыяльнымі свяцільнікамі – тлушчавымі лямпамі, якія давалі +5...+8 цяпла і асвятленне. Іглу выдатна ахоўваюць ад моцных вятроў. Унутры была мэбля – сядушкі з буйных кітовых пазванкоў, якія нагадваюць крэслы ў стылі мадэрн.

Эскімосы – здаровы народ. Асноўная ежа: рыба і кітовае, маржовае, цюленевае мяса ў марожаным, квашаным, вэнджаным, звараным выглядзе. Высока цанілася аленіна. Прыправай служыла раслінныя харчы, марская капуста, малюскі.

У XIX ст.пасля кантактаў з еўрапейскім насельніцтвам у жыцці эскімосаў адбыліся вялікія змены. Значная частка перайшла ад марскога промыслу да палявання на пясцоў, а ў Грэнландыі – да таварнага рыбалоўства. Частка грэнландскіх эскімосаў стала работнікамі і дробнымі прадпрымальнікамі.

## Сацыяльная арганізацыя

Звычайна эскімосы жывуць невялікімі групамі з некалькіх сямей колькасцю 5–25 чалавек. Часцей гэта сваякі па мужчынскай лініі. У XIX ст. эскімосы не мелі развітай племяннай арганізацыі. Не існавала павадыроў, уласнасці на зямлю. Кожны паляваў там, дзе хацеў.

Грамадства эскімосаў, як і чукчаў, было пазбаўлена нацыянальных забабонаў, было адкрытым. Археолагі адкрылі шматлікія архефакты, якія сведчаць аб культурных кантактах з іншымі народамі. Сярод эскімосаў не было жабракоў. Людзі не толькі кармілі сябе, але і мелі стабільны прыбавачны прадукт.

## Рэлігійныя вераванні і духоўная культура

Эскімосы беспамылкова арыентаваліся на моры і ў тундры, выдатна ведалі павадкі птушак і звяроў, шкоду і карысць раслін. Яны лічылі, што

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ў кожнай мясціны, стыхіі ёсць свой гаспадар або гаспадыня, добрым і злым духам прыносілі ахвярапрынашэнне. Гэты народ фактычна да гэтага часу захаваў многія анімістычныя ўяўленні, шаманізм, веру ў духаў.

Рэлігія эскімосаў звязана і з прамысловымі культамі. У іх быў асабліва развіты культ "гаспадыні мора" – **Седны**. Яна – дачка гаспадара свету. Бацька і дачка плылі па моры і пасварыліся. Бацька выкінуў яе ў мора. А калі яна спрабавала залезці ў лодку, адсек ёй пальцы. Людзі лічылі, што ад тых пальцаў у моры завялася рыба, звяры, кіты. Натуральна, што перад рыбалкай або паляваннем Седне – гаспадыні мора – ахвяравалі прынашэнні – ежу.

Эскімосы верылі ў дапамогу амулетаў на паляванні і рыбалцы. Замовы перадавалі ў спадчыну з пакалення ў пакаленне. За добрую замову старога чалавека прымалі ў сям'ю, забяспечвалі харчаваннем да самай смерці. У другой палове XIX ст. замовы сталі прадаваць за вялікія на той час грошы (ад 150 да 200 дол.).

Эскімосам было ўласціва адухаўленне ўсіх з'яў прыроды, уяўленні аб узаемасувязі ўсяго жывога. Яны вырылі, што ў свеце пастаянна адбываліся трансфармацыі жывога з аднаго віду ў іншы. Звер мог стаць чалавекам і наадварот. Таму паляўнічыя нязменна здзяйснялі абрад прымірэння з забітай жывёлай. Яны верылі, што яна хутка адродзіцца ў новым абліччы. Зверабой ніколі не нёс забітага звера адразу ў чум. Спачатку жонка выходзіла і "паіла" з рытуальнай міскі забітую жывёлу, а пасля ўжывання ў ежу чарапы жывёл адносіліся на свяцілішчы.

Эскімосы лічылі, што пасля смерці чалавека яго душа перасяляецца ў цела ўнучкі(ка) або праўнучкі(ка) і жыве там 7–8 гадоў, пакуль душа нашчадка не будзе дастаткова моцнай, каб існаваць самастойна. Гэтыя своеасаблівыя ўяўленні аб рэінкарнацыі – перасяленні душ – выклікалі асаблівасці эскімоскага выхавання. У іх не існавала фізічнага пакарання дзяцей. Пабіць малых – усё роўна што пабіць уласнага продка.

### Сучасныя этнічныя працэсы

Агульная колькасць эскімосаў расце на працягу апошніх дзесяцігоддзяў. У 1970-х гг. іх налічвалася каля 90 тыс. чал., у пачатку XXI ст. – каля 120 тыс. (ацэнка): у Расіі – 1,5, у Канадзе – 30, на Алясцы – 40, у Грэнландыі – 50 тыс. эскімосаў.

Эскімосы Заходняй Грэнландыі сфарміраваліся ў асобны народ. Агульная колькасць насельніцтва ў Грэнландыі на дадзены момант складае 58 тыс. чал., сярод якіх большасць (90%) складаюць эскімосы. Рэшта насельніцтва – гэта датчане ды іх продкі. З 1775 г. востраў з'яўляецца калоніяй Даніі.

З 1978 г. Грэнландыя атрымала права самастойна вырашаць свае ўнут-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

раныя справы. Найвялікшы ў свеце востраў сёння мае аўтаномію, свой парламент (31 дэпутат). Большасць у ім маюць сацыялісты і сацыял-дэмакраты. За Даніяй засталіся толькі законатворчасць, абаронная і знешняя палітыка. У дацкім парламенце зарэзерваваныя два месцы для прадстаўнікоў Грэнландыі. Эскімосы дамагліся самакіравання, але многія з іх хочуць стаць незалежнымі і ўступіць у Еўрасаюз. У лістападзе 2008 г. плануецца правядзенне рэферэндуму па пашырэнні аўтаноміі Грэнландыі.

Эскімоскі народ Канады, вядомы пад саманазвай **інуіты** (англ. *Inuit*), дабіўся сваёй дзяржаўнасці 1 красавіка 1999 г., калі была створана тэрыторыя **Нунавут**, вылучаная з Паўночна-Заходніх тэрыторый, а ў XXI ст. на паўвостраве Лабрадор таксама з'явіліся дзве эскімоскія аўтаномныя акругі.

Паўсюдна рэшткі традыцыйнай культуры эскімосаў хутка знікаюць. Затое шпарка развіваецца сучасная культура. У Грэнландыі эскімоскае пісьменства на аснове лацінскай графікі з'явілася з сярэдзіны XIX ст., а ў ЗША і Канадзе – з 1970-х гг. У Расіі з 1937 г. створана пісьменства на базе рускай графікі. Эскімосы Аляскі ў значнай ступені англамоўныя і хрысціянізаваныя. Канадскія інуіты сёння – адзін з найбольш камп'ютэрызаваных народаў свету. Па колькасці камп'ютэраў на душу насельніцтва яны апераджаюць і амерыканцаў, і японцаў.

**Пытанні для самакантролю:**

Калі эскімосы сфарміраваліся як этнас і сталі сяліцца на арктычным узбярэжжы Амерыкі?

Да якога расавага тыпу адносяцца эскімосы і алеуты?

У якую моўную сям'ю ўваходзяць мовы эскімосаў і алеутаў?

Як перакладаецца слова "эскімос"?

Да якога гаспадарча-культурнага тыпу адносіліся эскімосы да прыходу еўрапейцаў?

На якіх марскіх і сухапутных жывёл палявалі эскімосы і алеуты?

Дакажыце, што эскімосы змаглі выдатна прыстасавацца да жыцця ў Арктыцы.

Якія прылады працы выкарыстоўвалі эскімосы?

Якое адзенне і жытло прыдумалі эскімосы для выжывання ў суровых умовах Арктыкі?

Каму пакланяліся ўва што верылі эскімосы?

Чым выкліканы асаблівасці выхавання ў эскімоскіх сем'ях?

У якіх краінах і ў якой колькасці пражываюць эскімосы?

Эскімосы якіх рэгіёнаў дамагліся самакіравання, а ў якіх ставяць пытанне аб незалежнасці?

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

# ІНДЗЕЙЦЫ ПАЎНОЧНАЙ АМЕРЫКІ

## Антрапалагічная і лінгвістычная сітуацыя да вялікіх геаграфічных адкрыццяў

На поўдзень ад эскімосаў пражываюць шматлікія індзейскія народы Амерыкі. **Індзейцы** – усё карэннае насельніцтва гэтай часткі свету (акрамя эскімосаў і алеутаў). Назва ўзнікла ад памылковага ўяўлення першых еўрапейскіх мараходаў (Хрыстафора Калумба і інш.), якія лічылі адкрытыя імі заатлантычныя землі Індыяй.

Па **антрапалагічным тыпе** індзейцы належаць да амерыканоіднай расы – адгалінавання вялікай мангалоіднай расы. Яны маюць чорныя валасы, цёмныя вочы, бурае адценне скуры, вялікі твар. Барада і вусы растуць слаба. Слаба развіты эпікантус і адносна буйны нос (часам з гарбінкай – "арліны") адрозніваюць **амерыканоідаў** ад мангалоідаў. Амаль усе яны маюць I групу крыві. Гэтыя адрозненні можна растлумачыць або варыяцыямі, якія ўзніклі ўжо на Амерыканскіх кантынентах, або захаваннем амерыканоідамі шэрагу рыс старажытных мангалоідаў.

Індзейцы – вялікая і вельмі разнастайная група народаў, якая моцна адрозніваецца як у лінгвістычным, так і ў гаспадарча-культурным плане. Моўная дробнасць і стракатасць індзейскіх народаў надзвычай вялікія. Мовы карэнных амерыканцаў вывучаны вельмі нераўнамерна. Многія з іх зніклі перш чым іх удалося зафіксаваць. Ад некаторых іншых засталіся запісы некалькі дзесяткаў слоў.

Затое геаграфічныя назвы кантынента з большага маюць індзейскае паходжанне. З 48 штатаў (без Аляскі і Гавайскіх астравоў) палова – 23 – маюць індзейскія назвы: напрыклад, Мічыган, Вісконсін, Мінесота, Дакота, Небраска, Арэгон, Юта, Айдахо, Алабама, Дэлавэр, Канзас, Аклахома і г. д. Усе буйныя паўночнаамерыканскія азёры таксама носяць свае дакалумбавыя назвы: Гурон, Эры, Антарыа, Вініпег, знакаміты Мічыган і інш. Падобная сітуацыя і з назвамі рэк. Дастаткова назваць Місісіпі, Місуры. Да гэтага часу назвы алганкінскіх плямён носяць дзесяткі буйных гарадоў, напрыклад, Майамі, Чыкага і г.д.

Мовы Новага Свету моцна адрозніваюцца ад моўных сістэм Старога перш-наперш сваёй граматычнай структурай. Упраўленне словамі здзяйсняецца тут інакш: у дзейніку, паміж коранем і канчаткам, могуць быць устаўлены іншыя часціны мовы. Гэта ўскладняе вывучэнне генеалагічнай моўнай роднасці. Адны лінгвісты налічваюць да 2000 моўных сямей (кожная мова – сям'я), іншыя – менш 100.

## 1. ПАЛЯЎНІЧЫЯ І ЗБІРАЛЬНІКІ ЛЯСНОЙ ЗОНЫ

На поўдзень ад Арктыкі ў лясной зоне пражывае вялікая колькасць разнастайных індзейскіх плямёнаў. Яны адрозніваюцца ў лінгвістычным плане і дзеляцца на дзве вялікія групы.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Атапаскі (атабаскі)** –група роднасных па мове плямён, што жывуць уздоўж Ціхага акіяна і Кардыльераў ад Аляскі і Поўначы Канады да Мексікі. Частка з іх асімілявана амерыканскай культурай, але значная частка жыве з паляўніцтва, гандлю футрам, рыбалоўства. Продкі атапаскаў былі перадапошнімі перасяленцамі з Азіі ў 5–4 тыс. да н.э. У працэсе рассялення яны падзяліліся на тры групы. Большасць жыве на Паўночным Захадзе Канады. Паўночныя атапаскі жывуць на захадзе субарктычнай зоны. У адрозненні ад іншых індзейцаў яны не былі паселеныя ў рэзервацыі, займалі частку сваіх спрадвечных зямель у Канадзе. Ціхаакіянскія атапаскі жывуць у паўночнай Каліфорніі і Арэгоне. Частка плямён у XII ст. перасялілася на поўдзень да ракі Каларада. **Навахі** і знакамітыя па кінастужках **апачы** складаюць паўднёвую групу **атапаскаў** (саманазва – **ДЭНЭ**).

На ўсход ад атапаскаў жывуць **алганкіны**. Яны з старажытнасці рассяліліся ў раёне Вялікіх азёр, правінцыі Антарыа ў Канадзе. Затым засялілі лясныя раёны Канады і поўнач ЗША. Алганкіны дзеляцца на чатыры групы: паўночна-ўсходнія, прыатлантычныя, цэнтральныя і заходнія (стэпавыя). Першыя дзве групы займаліся не толькі паляўніцтвам, збіральніцтвам, але і часткова земляробствам.

## Гаспадарчая дзейнасць і матэрыяльная культура

Матэрыяльная культура індзейскіх плямёнаў лясной зоны, нягледзячы на адрозненне па паходжанні і мове, мелі шмат агульнага. Лад жыцця і паўночных атапаскаў і алганкінаў быў падобны, што вызначалася перш-наперш падабенствам прыродна-кліматычных умоў на тэрыторыях іх пражывання. І тыя і другія вялі субарктычны тып гаспадаркі. Аснова іх гаспадаркі – збіральніцтва і паляванне. Рыбалоўства мела дапаможны характар. Аб'екты і прыёмы палявання былі тыповымі для таёжных народаў. Палявалі індзейцы на лася, снежную казу, барана, пералётных птушак і перш-наперш на амерыканскага лася **карыбу**. Таму ў літаратуры ЗША іх часта называюць “паляўнічыя на аленя карыбу”.

Індзейцы летам малымі, а зімой вялікімі групамі перакачоўвалі па сваіх паляўнічых угоддзях. Пад час веснавых і восеньскіх міграцый аленяў на месцах перапраў праз рэкі яны рабілі масавы забой карыбу і нарыхтоўкі на зіму. Паспяховае паляванне забяспечвала ўсім неабходным: на харчаванне ішло мяса, на адзенне і на жыллё выкарыстоўвалі скуры. Але паляванне і рыбалоўства мела сезонны характар. Таму важную ролю адыгрывалаі збіральніцтва, якім займаліся дзеці і жанчыны. Яно давала расліннае харчаванне ў дадатак да мяснога.

Прылады працы індзейцы выраблялі з косці, камню, дрэва. Пры паляванні яны выкарыстоўвалі лук і стрэлы, капканы, сілкі, дзіды. Традыцыйная баявая зброя – паліца з дрэва з каменным ці металічным наканечнікам. Індзейцы ведалі медзь, якая ішла ў асноўным на ўпрыгожванні. Яны

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ўмелі будаваць лодкі з кары і берасты. Зімой рухаліся на санях, ведалі снегаступы.

**Адзенне** – кашулі, нагавіцы і коўдры – выраблялі са скур, упрыгожвалі калючкамі дзікабраза, пазней бісерам. З аленевых скур індзейцы выраблялі замшу. Здабывалі і выкарыстоўвалі яны і футра. Вопратка паляўнічых на карыбу стала сімвалам індзейскага адзення: кашулі (мужчынскія да кален, а жаночыя даўжэй) з доўгімі рукавамі, нагавіцы, макасіны на нагах. Летам адзенне было з замшы, зімой з футра. Галаву пакідалі непакрытай, толькі ў халады насілі футравы капюшон. Затое амаль абавязковым было нашэнне ўпрыгожанняў з пер'я. У залежнасці ад сацыяльнага статусу галаўныя ўборы былі простыя ці больш складаныя.

**Жытло** індзейцы будавалі разнастайнае: навесы, услоны, крытыя карой канічныя шалашы, канічныя намёты, каркасныя вялікія прамавугольныя дамы, **вігвамы**. Апошняе жыллё – купалападобнае, пакрытае скурамі ці карой (нагадвае чум), было вельмі папулярнае ў лясных паляўнічых Канады. У горных раёнах будавалі каменнае ці глінянае жытло.

У XIX ст. пасля кантактаў з еўрапейскім насельніцтвам у жыцці індзейцаў лясной зоны адбыліся вялікія змены. Значная іх частка перайшла ад традыцыйнага палявання да здабычы футры. Яны сталі залежаць ад менавога гандлю пушнінай. Распаўсюджванне жалезных нажоў, сякер, стрэлаў павялічыла прадукцыйнасць палявання. Узрасла роля мужчын і асобных сямей. Пачаліся ваенныя сутыкненні.

Прыатлантычныя і паўночна-ўсходнія алганкіны па сваёй матэрыяльнай культуры набліжаліся да іракезаў. Яны часткова займаліся і земляробствам. Збіралі кляновы сок. У якасці менавога эквіваленту выкарыстоўвалі пацеркі з ракавін.

### Сацыяльная структура

Асновай грамадскай арганізацыі індзейцаў была невялікая радавая абшчына. Некалькі разоў у год абшчыны збіраліся разам. Тады вырашаліся агульнаплемянныя справы: заключаліся шлюбы, выконваліся рэлігійныя рытуалы... Для традыцыйнай сацыяльнай арганізацыі ўсіх атапаскаў характэрны рысы мацярынскага роду, якія захаваліся да XX ст. У большасці алганкінаў род патрылінейны, шлюб – патрылакальны. У XIX ст. частка апошніх аб'induналася ў канфедэрацыю Вабанакі.

### Рэлігійныя вераванні

Да прыходу еўрапейцаў у індзейцаў быў распаўсюджаны татэмізм, шаманізм, розныя родаплемянныя культы, паляўнічыя культы, вера ў асабістых духаў апекуноў. Асноўны культ – вера ў Вялікі дух **Маніту**.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Увесь час у пошуках ежы індзейцы качавалі. Гэтыя асаблівасці жыцця парадзілі спецыфічныя рэлігійныя вераванні – пакланенне сонцу. Склаўся культ сонца. Яму ахвяравалі ежу. Такая ахвяра ў тыя часы была раскошай. Таму часцей ахвяравалі ўласнай пакутай, голадам. Увасабленнем сонца лічыліся кола, крыж. Свяшчэнная лічба – 4. На стаянках па контуры круга звычайна размяшчалі вогнішчы. У цэнтры знаходзіўся слуп, вакол якога адбываліся **сонечныя танцы** – абрадавыя дзеянні, пад час якіх прыносіліся рытуальныя ахвярапрынашэнні. Пад час танцаў індзейцы рабілі надрэзы на сваёй скуры, праз якія прадзявалі рэмні і прывязвалі сябе да слупа.

Існавала знахарства. Для амерыканскіх індзейцаў характэрна **Катарсічная** (Катарсіс – ачышчэнне) **Магія**: кровапусканне, ачышчэнне страўніка, паравая лазня.

Індзейцы мелі багатую міфалогію, цікавыя казкі і легенды, прыгожыя танцы і гульні. Культурны герой міфаў – "Вялікі Кролік". Традыцыйны музычны інструмент – бубен.

## Аселыя рыбаловы паўночна-заходняга ўзбярэжжа Паўночнай Амерыкі

Індзейцы лясной зоны і паўночна-заходняга ўзбярэжжа Паўночнай Амерыкі былі блізкі ў сваім культурным, сацыяльным жыцці. Тым не менш, геаграфічныя асаблівасці рэгіёна вызначылі пэўныя асаблівасці матэрыяльнай і духоўнай культуры тутэйшых плямён. У перыяд нерасту мясцовыя рэкі былі поўныя рыбы, якая станавілася адносна лёгкай здабычай індзейцаў. Рыбалоўства было галоўнай крыніцай харчавання.

Спецыфіка іх прыродных умоў і заняткаў паўплывала на матэрыяльную культуру і сацыяльную арганізацыю. Тут развіваўся абмен, назіралася маёмасная дыферэнцыяцыя і нават патрыярхальнае рабства. Для племяннной арганізацыі ўласціва строгая іерархічная структура. Племянныя саветы арганізоўвалі марскі промысел, усталёўвалі парадак выкарыстання ўгоддзяў і ахоўвалі іх, прымалі рашэнні аб рэйдах для захопу рабоў сярод іншаплеменнікаў. Найбольш заможныя індзейцы часцей за ўсіх выбіраліся ў племянныя саветы. Яны час ад часу ладзілі свята **Потлач**, пад час якога частавалі суродзічаў, раздавалі сваю маёмасць. Апошняе кампенсавалася ім пазнейшымі падарункамі суродзічаў і дапамогай у працы. Племянныя сувязі былі вельмі трывалымі.

## 2. ЗБІРАЛЬНІКІ І ПАЛЯЎНІЧЫЯ КАЛІФОРНІІ

Індзейцы Каліфорніі жылі ў вельмі спрыяльных прыродна-кліматычных умовах. У Каліфорніі, мабыць, лепшы клімат у свеце. Сухое і цёплае з-за пустыні, але не гарачае паветра астуджвае акіянскае халоднае цячэнне.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Прырода краю надзвычай багатая, што сфарміравала ў розных у моўных адносінах індзейскіх народаў падобны тып гаспадаркі, у аснове якога ляжала інтэнсіўнае збіральніцтва. Плады, карэнне, насенне, жалуды складалі асноўны рацыён харчавання тутэйшых плямён. У пачатку XIX ст. індзейцаў тут пражывала каля 160 тыс. чалавек. Але пасля адкрыцця ў 1848 г. запасаў золата хваля золаташукальнікаў змывае з паверхні Каліфорніі адно індзейскае племя за другім. Колькасць індзейцаў скарацілася ў рэгіёне ў 10 разоў.

Адзін з самых вядомых народаў гэтай зоны – індзейцы **пома**, якія пражываюць на паўночна-заходняй частцы Цэнтральнай Каліфорніі. Галоўным заняткам пома было інтэнсіўнае збіральніцтва. Жалуды збіраліся, пераціраліся, з мукі выпякаліся аладкі.

Дапаможную ролю ў гаспадарцы адыгрывала паляванне. У мінулым пома, відаць, займаліся земляробствам, аб чым сведчаць здольнасці выдатна плесці кошыкі, якія нават трымалі ваду. Але ў спрыяльных кліматычных умовах адбыўся рэгрэс культуры ад земляробства да інтэнсіўнага збіральніцтва. Пома практычна не мелі адзення і не будавалі жылля ў сувязі з мяккім і цёплым увесь год надвор'ем.

Вядомы каліфарнійскія індзейцы і арыгінальнай рэлігіяй. **Візіянізм** (відовішча) звязаны з абрадам ініцыяцыі. Напярэдадні яе на працягу месяца маладых людзей трымалі на строгай дыеце.

Сам абрад заключаўся ва ўжыванні алкагольнага напою – **талаячэ** (з кактуса), які дазвалялі піць раз ў жыцці. Тое, што індзеец бачыў пасля ўжывання алкаголю, станавілася яго богам на ўсё астатняе жыццё. Рэлігія пома была індывідуалістычнай.

## 3. ПАЛЯЎНІЧЫЯ ПРЭРЫЙ

У лесастэпавай зоне (**прэрыях**) Паўночнай Амерыкі індзейскае насельніцтва было да еўрапейскай каланізацыі адносна маталікім. Прэрыі былі маладаступныя для пешага індзейца. Жыццё іх было звязана з паляваннем на бізонаў. Яны давалі мяса, скуры для палатак і адзення. Індзейцы палявалі ў прэрыях на бізонаў, ладзячы для іх спецыяльныя загоны, у якіх іх забівалі. Пешае паляванне давала мінімум здабычы.

У выніку еўрапейскай каланізацыі многія плямёны ўсходу аказаліся выцеснены ў гэты рэгіён або па законе аб перасяленні індзейцаў, які прыняў Кангрэс ЗША, былі пераселены ў 1930-х гг. у штат Аклахома. У выніку асноўная маса індзейцаў загінула ад голаду і эпідэмій.

У пачатку XVIII ст. амерыканскія індзейцы навучыліся прыручаць здзічэлых коней – **мустангаў**. Гэта змяніла іх культуру. Засваенне конегадоўлі рэзка павялічыла эфектыўнасць палявання і змяніла ўклад жыцця індзейцаў. Яны палявалі з дапамогай лука і стрэлаў, коп'яў і ружжаў. З апошніх індзейцы

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

стралялі вельмі кепска, бо ў іх не хапала патронаў для трэніровак. Асноўнай зброяй і характэрнай рысай культуры стаў традыцыйны іспанскі складны жалезны нож – **Наваха**.

Знікла пагроза голаду, але ўзнікла канкурэнцыя за паляўнічыя ўгоддзі. З'явілася калектыўная ўласнасць на зямлю. Гэта адрознівае мясцовыя плямёны ад іншых народаў, што займаюцца паляваннем і збіральніцтвам. Павялічылася **мілітарызацыя культуры**. Галоўным мужчынскім заняткам стала вайна, а паказчыкам мужчынскай годнасці, ваенным трафеем паўночнаамерыканскіх індзейцаў – скальпы.

Племянная арганізацыя індзейцаў захоўвалася, але роля плямён узрасла. Пачалі фарміравацца элементы ваеннай дэмакратыі. Асобныя індзейскія павадыры мелі тысячныя статкі коней, за якімі даглядалі іх збяднелыя суродзічы. Тым не менш, індзейскія павадыры не мелі значнай улады над астатнімі індзейцамі. Шаманы карысталіся вялікім, часцяком большым, чым павадыры, аўтарытэтам. Яны ўмелі кантактаваць з духамі і, дзякуючы гэтаму, лячыць хворых, прадказваць будучыню, кіраваць надвор'ем і г.д. Рабочымі інструментамі шаманаў былі бубен і трашчотка.

Усё адзенне мужчын і жанчын выраблялася з апрацаваных скур бізонаў. Асноўным штодзённым адзеннем мужчын была набедраная павязка і асобыя "гамашы" – нагавіцы, якія закрывалі ногі вышэй шчыкалатак. Абуваліся індзейцы ў макасіны, якія багата ўпрыгожваліся калючкамі дзікабраза. Жанчыны насілі доўгае прамое адзенне з замшы. Баявыя кашулі, упрыгожаныя скальпамі, насілі толькі павадыры і самыя мужныя воіны племені. Яны насілі налобныя павязкі з арлінымі пер'ямі. Кожнае пяро абазначала пэўны мужны ўчынак воіна. Ва ўрачысты строй уваходзіў і плашч, на якім часта мясціліся вывы подзвігаў яго ўладара. Пер'е было па-рознаму пафарбавана і падрэзана. Кожнае адценне і зарубка мелі свой сэнс. Воіны ўпрыгожвалі сябе таксама караламі з кіпцюроў грызлі.

Далейшае рассяленне белых прывяло да масавага забойства бізонаў – асноўнай ежы індзейцаў – і войнаў апошніх з прышэльцамі. Найбольш вядомыя па кінастужках качавыя паляўнічыя **апачы** доўга ваявалі з белымі пасяленцамі. Сёння яны пражываюць у рэзервацыях паўднёва-ўсходніх штатаў ЗША. Там жа пражываюць не менш цікавыя **навахі.** У XIV – пачатку XV ст. яны прыйшлі з поўначы разам з апачамі. Спачатку земляробы, а з XVIII ст. жывёлаводы навахі ваявалі за незалежнасць (з 1846 па 1867 гг.). Прайгралі, але ў выніку перасялення ў рэзервацыю плошчай 60 тыс. км$^2$ (дзве Магілёўскія вобласці) выжылі. Такім чынам, у канцы XIX ст. самая маладая культура паўночнаамерыканскіх індзейцаў знікае. Яе выцясняе культура белага чалавека.

На тэрыторыі, дзе пражываюць навахі, знаходзяць 3–5-павярховыя жылыя мураваныя і высечаныя ў скалах комплексы. Калісьці тут квітнела



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

земляробства. Росквіт гэтай культуры прыйшоўся на XII – XIII стст. У XIII ст. насельніцтва таямніча знікла.Згодна з гіпотэзай амерыканскіх вучоных у 1064 г. моцнае вывяржэнне вулкана зрабіла глебы больш вільготнымі, бо попел не даваў вадзе выпарвацца. Насельніцтва вырасла. З'явіліся мураваныя будынкі, пляцоўкі для сходаў, для спартыўных гульняў. А ў XIII ст. павелічэнне колькасці насельніцтва і інтэнсіўнае земляробства прывяло да збяднення глебы. Высокаразвітая культура знікла. Магчыма, яе стварылі індзейцы "пуэбла", якія пазней пражывалі на мяжы ЗША і Мексікі.

## 4. РУЧНЫЯ ЗЕМЛЯРОБЫ

Земляробчыя народы Амерыкі культывавалі сельскагаспадарчыя культуры ў самых розных прыродна-кліматычных зонах. Новы свет адарыў чалавецтва кукурузай – маісам, бульбай, таматамі, тытунём, баваўнай, сланечнікам, какавай і іншымі культурнымі раслінамі.

### Іракезы

На поўдзень ад алганкінаў у раёне вялікіх амерыканскіх азёраў пражывалі пяць плямёнаў **іракезаў**. Іх саманазва – "Народ доўгага дома". На поўдзень ад іх да самага Карыбскага мора жылі сваяцкія іракезам плямёны моўнай сям'і **хока-сіу**. Гэтыя групы індзейцаў ведалі ручное земляробства.

Іракезы займаліся лядна-агнявым земляробствам. Яны выпальвалі ўчастак лесу, а потым культывавалі на ім такія культуры, як кукурузу, сухадольны рыс, гарбузы, тытунь (якім яны адарылі свет). Глебу апрацоўвалі завостранымі палкамі або прымітыўнымі матыкамі. Іракезы вялі часткова аселы лад жыцця. Кожныя 10–15 год пасля зніжэння ўраджаяў яны перасяляліся на новае месца. Земляробства было галоўнай крыніцай харчавання. Важную ролю ў іх адыгралі таксама збіральніцтва, паляванне, рыбалоўства.

Амерыканскія сельскагаспадарчыя культуры былі прапашнымі. Яны патрабавалі апрацоўкі глебы – рыхлення, акучвання ў перыяд усяго часу росту раслін. Вядучая роля ў земляробстве належала жанчынам. Яны апрацоўвалі палеткі амаль без мужчын. Апошнія ігралі важную ролю толькі пры расчыстцы зямельных участкаў. Такая спецыфіка палавога падзелу працы моцна паўплывала на сацыяльную арганізацыю іракезаў. Сацыяльны статус іх жанчын быў адным з самых высокіх з усіх вядомых у свеце народаў традыцыйных грамадстваў.

Аснова **сацыяльнага жыцця** іракезаў – мацярынская радавая абшчына **авачыра**. У яе ўваходзілі сваякі па жаночай лініі. Звычайна авачыра займала адзін крыты карой каркасны "доўгі дом" на 10 і болей сямей, у якім жылі ўсе замужнія жанчыны, іх мужы і дзеці. Шлюб быў парным. На чале абшчыны стаяла старая вопытная жанчына, якая кіравала як гаспадаркай, так



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

і сацыяльным жыццём. Члены роду калектыўна апрацоўвалі глебу і збіралі ўраджай. Кіраўніца размяркоўвала запасы ежы паміж сем'ямі. Яна дагледала, каб усе добра працавалі, асабліва мужы, якія прыходзілі з другіх абшчын. Права ўласнасці пераходзіла па жаночай лініі. Авачыра абараняла правы членаў роду.

Некалькі авачыр складалі іракезскі род. У племя ўваходзіла ад 3 да 8 радоў. Некалькі радоў аднаго племені аб'ядноўваліся ў фратрыю. Рады адной фратрыі называліся брацкімі, рады розных фратрый аднаго племені лічыліся стрыечнымі. Брак паміж членамі роду і фратрыі быў забаронены. У кожнага роду было сваё імя, якое ён атрымоўваў ад татэмнай жывёлы.

Жанчыны дамінавалі ў паселішчах і адказвалі за духоўнае жыццё племені, а мужчыны былі своеасаблівай выканаўчай уладай і адказвалі за знешнія сувязі. Правадырамі плямён былі мужчыны, якіх на гэтую пасаду выбіралі маткі кланаў. У XVIII – XIX стст. усё большую ролю ігралі племянныя саветы. Кожны род выбіраў туды сваіх прадстаўнікоў. Сходы былі адкрытыя для ўсіх, кожны мужчына меў права выступіць. Рашэнні прымаліся аднагалосна. На сходах вырашаліся пытанні вайны і міру, уладжваліся канфлікты. Апошнія, дарэчы, імкнуліся вырашаць мірна. Нават у выпадку забойства вінаваты род звычайна аддаваў аднаго з сваіх членаў пацярпеўшаму, а той яго ўсынаўляў.

**Палітычная структура.** Іракезы далі свету не толькі тытунь, ваяўнічыя панкавыя прычоскі, але і традыцыі дэмакратыі. У іх, па некаторых дадзеных, каля 800 гадоў існавала так званая **Іракезская ліга** (ці канфедэрацыя) пяці, пазней шасці іракезскіх плямёнаў-нацый. Гэта – адна з найстарэйшых у свеце дэмакратычных рэспублік, якая па еўрапейскіх крыніцах дакладна існавала з 1570-х гг. да канца XVIII ст. Ваяўнічыя варожыя плямёны змаглі аб'яднацца ў палітычны саюз на аснове роўнасці, узаемнай павагі і братэрства. Для бацькоў заснавальнікаў ЗША канфедэрацыя стала адным з праобразаў амерыканскай дэмакратыі. Пад час абмеркавання дэкларацыі незалежнасці іракезскія правадыры ўдзельнічалі ў пасяджэннях кангрэса ЗША.

**У рэлігійных уяўленнях** іракезаў трывалае месца займалі радавыя культы, шанаванне татэмных жывёл, магічныя ўяўленні.

Індзейцы яшчэ да прыходу белых стварылі сваё пісьмо. Так, алганкінскія дэлавэры мелі піктаграфічнае пісьмо.

**Індзейцы пуэбла**

На ўрадлівых землях мяжы ЗША і Мексікі пражывалі індзейцы **пуэбла**. Яны стварылі развітае земляробства са штучным арашэннем палеткаў. Сваю назву тутэйшыя індзейцы атрымалі ад еўрапейцаў па назве сваіх паселішчаў, у якіх дамы мясціліся адзін на адным і тэрасамі падымаліся па схілах пагоркаў. Страха аднаго дома з'ўлялася дваром іншага. У пуэбла таксама, як і ў іракезаў, назіраліся элементы матрыярхату.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# 5. СУЧАСНЫЯ ЭТНІЧНЫЯ ПРАЦЭСЫ ПАЎНОЧНАЙ АМЕРЫКІ

Еўрапейская каланізацыя прыпыніла натуральнае развіццё абарыгенаў Амерыкі. У выніку многія плямёны і народы былі цалкам ці часткова знішчаны, выцеснены або перaселены ў менш спрыяльныя для жыцця раёны пражывання. Большасць індзейцаў не магла і не жадала прыстасоўвацца да новай ролі ў чужым для іх свеце. Колькасць загінуўшых у афіцыйных "індзейскіх войнах" была адносна невялікай. Па афіцыйных падліках Бюро перапісу насельніцтва ЗША, з 1775 па 1890 г. у ваенных сутыкненнях загінула 45 тыс. індзейцаў. Тым не менш, перасяленне абарыгенаў са звыклых месцаў жыхарства і выклiканы гэтым голад, інфекцыі, супраць якіх у індзейцаў не было імунітэту, алкагалізацыя і асіміляцыя насельніцтва зрабілі сваю справу. Колькасць індзейцаў Канады і ЗША скарацілася з 2–4 млн да пачатку масавай каланізацыі да 200 тыс. у канцы XIX ст.

На працягу XX ст. колькасць індзейцаў расла хутчэй, чым белае і чорнае насельніцтва. У канцы стагоддзя індзейцы складалі 0,8% насельніцтва ЗША. Такім чынам, колькасна індзейскія народы амаль аднавілі сваю дакаланіяльную колькасць. Але ў ЗША і Канадзе яны хутка асімілююцца і прыблізна з 500 індзейскіх моў захавалася не болей за 150. Кампактна індзейцы жывуць пераважна ў **рэзервацыях** – тэрыторыях, якія адведзены для пражывання выжыўшых пасля еўрапейскай каланізацыі індзейцаў. У іх захоўваюцца элементы традыцыйнай культуры і яшчэ жывуць мовы. Так, у пачатку XXI ст. у паўночна-заходняй частцы Цэнтральнай Каліфорніі налічвалася каля 5 тыс. індзейцаў **пома**. Праўда, з іх толькі 250 з'яўляюцца носьбітамі памаанскіх моў. Сёння пома хрысціяне – католікі, пратэстанты, праваслаўныя. Каля 21 тыс. апачы пражываюць у рэзервацыях штатаў Арызона, Аклахома, Новая Мексіка, 220 тыс. наваха пражываюць у штатах Арызона, Новая Мексіка, Юта. Каля 60 тыс. іракезаў жывуць у штатах Нью-Йорк і Аклахома, 30 тыс. – у канадскіх правінцыях Антарыо і Квебек.

Большасць народаў Амерыкі маюць стракаты расавы і этнакультурны склад. Яны фарміраваліся ў выніку міксацыі і інтэграцыі разнародных этнічных груп, якія, як правіла, мала звязаны з абарыгеннымі этнасамі. ЗША і Канада ўтварыліся як перасяленчыя калоніі. Перасяленцы з Еўропы слаба змешваліся з рэдкім туземным насельніцтвам. Брытанскія і французскія каланісты перасяляліся, як правіла, сем'ямі. Жанчын (у тым ліку і асуджаных за розныя злачынствы) таксама спецыяльна дастаўлялі з Еўропы. У такіх умовах метысацыя мела абмежаваны характар.

Асноўная частка амерыканскай нацыі ўтварылася ад змяшэння нашчадкаў перасяленцаў з розных краін Еўропы, а таксама неграў-рабоў з Афрыкі. Найбольшая колькасць перасяленцаў прыбыла з Ірландыі, за імі ідуць Англія,



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Шатландыя, Германія, Швецыя, Францыя, Італія, Польшча, Украіна і іншыя еўрапейскія краіны. Насельніцтва ЗША ўнутрана неаднастайнае. Афраамерыканцы складаюць каля 12% насельніцтва, з іх большасць пражывае ў паўднёвых штатах. У другой палове XX ст. узмацніўся прыток эмігрантаў з Азіі і Лацінскай Амерыкі. У некаторых штатах поўдня ЗША колькасць іспанамоўных жыхароў дасягае трэці насельніцтва. Там дыскуціруецца пытанне аб наданні іспанскай мове статусу афіцыйнай ці нават другой дзяржаўнай. Жыхары гарадоў і субурбанізаваных зон (прыгарадаў) складаюць каля 80% насельніцтва.

Насельніцтва Канады больш аднастайнае ў расавых адносінах, чым ЗША. Але яно складаецца з англа-канадцаў (44%) і франка-канадцаў (28%), якія пражываюць пераважна ў правінцыі Квебек. У 1867 г. пры стварэнні канадскага дамініёна англійская і французская мовы былі прызнаны афіцыйнымі. З 1969 г. у краіне праводзіцца палітыка двухмоўя. Французская і англійская мовы ўраўнаваны ў правах, а з 2003 г. чыноўнікі цэнтральных ведамстваў абавязаны здаваць экзамен на валоданне імі. Тыя, хто авалодаў і англійскай, і французскай мовай, атрымоўваюць надбаўкі 30% да заробкаў.

У Канадзе, як і ЗША, пануе сучасная ўрбаністычная культура. У гарадах жыве 80% канадцаў, 90% – уздоўж граніц з ЗША. У зоне паўночных хваёвых лясоў пражывае каля 500 тыс. індзейцаў (1,5%). Паўночныя атапаскі, у адрозненні ад іншых індзейцаў, не былі паселены ў рэзервацыі і займаюць частку сваіх спрадвечных зямель у Канадзе. Тут найдаўжэй індзейцы вялі традыцыйны лад жыцця.

Сучасныя заняткі індзейцаў Канады і ЗША – лесаздабыча, збіральніцтва ягад, традыцыйныя промыслы, у тым ліку пляценне кошыкаў, абслугоўванне турыстаў. У некаторых рэзервацыях індзейцы працуюць "індзейцамі", імітуючы для багатых турыстаў традыцыйны лад жыцця. Важнай крыніцай прыбыткаў для жыхароў рэзервацый з'яўляецца ігральны бізнес. Ім належыць прывілей мець казіно. Іншыя плямёны змагаюцца за гэта права. Так, губернатар Каліфорніі Шварцэнэгер пасля прыходу да ўлады правёў спецыяльны акт, які дазволіў індзейцам пома будаваць казіно на сваёй тэрыторыі. Такая палітыка многіх штатаў прывяла да павелічэння прыбыткаў індзейцаў. Дзякуючы прыстасаванню да сучаснага жыцця, некаторыя плямёны з'яўляюцца калектыўнымі акцыянерамі буйных кампаній, валодаюць вялізным багаццем.

Назіраюцца працэсы індзейскага адраджэння. Індзейскае паходжанне перастала быць плямай у біяграфіі і нават стала прэстыжным. Калі ў XX ст. у гарадах і на фермах жыло шмат так званых "нябачных індзейцаў", якія выдавалі сябе за белых, каб пазбегнуць дыскрымінацыі, то цяпер каля 10 млн амерыканцаў прэтэндуюць на сваё паходжанне ад карэнных амерыканцаў.

Сярод вернікаў ЗША пераважаюць пратэстанты – 55%, католікі – 30%, ёсць іудаісты – 3%, праваслаўныя, мусульмане, будысты і інш. У Канадзе найбольшая абшчына католікаў – 42%. Большасць індзейскіх народаў



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Паўночнай Амерыкі спавядаюць розныя накірункі пратэстантызму. Для некаторых уласцівы сінкрэтызм – спалучэнне хрысціянскіх і традыцыйных вераванняў.

У Цэнтральнай Амерыцы на поўдзень ад ЗША жывуць народы метыснага паходжання. Нашчадкі іспана-індзейскіх шлюбаў сталі асновай гандураскай, нікарагуанскай і іншых нацый. Пры фарміраванні мексіканцаў і гватэмальцаў індзейцы сыгралі яшчэ больш важную ролю. Найбольш індзейцаў, у тым ліку знакамітых майя (каля 700 тыс. чалавек), захавалася ў горных раёнах паўднёвай Мексікі і Гватэмалы. У Мексіцы – найбуйнейшай краіне рэгіёна – 75% насельніцтва складаюць іспана-індзейскія метысы, нашчадкі еўрапейцаў – 15%, а індзейцы – толькі 9%.

На большай частцы астравоў Карыбскага басейна індзейскае насельніцтва было амаль цалкам знішчана. Нацыі фарміраваліся з завезеных з Афрыкі рабоў і перасяленцаў з Еўропы. Негры і мулаты – асноўнае насельніцтва астраўных краін Вест-Індыі.

**Пытанні для самакантролю:**

• Як узнікла назва карэннага насельніцтва Амерыкі?

• Да якога расавага тыпу адносяцца індзейцы?

• Чаму ў літаратуры сустракаюцца розныя лічбы колькасці моўных сямей і моў карэннага насельніцтва Амерыкі?

• Чым адрозніваюцца моўныя сістэмы Новага і Старога Свету?

• Якія асноўныя індзейскія народы пражываюць у Паўночнай Амерыцы?

• У чым супадалі і чым адрозніваліся гаспадарчыя заняткі пома, атапаскаў, алганкінаў, апачы, іракезаў?

• На якіх жывёл палявалі індзейцы ў прэрыях, а на якіх – у лясной зоне?

• Якія сельскагаспадарчыя культуры вырошчвалі іракезы?

• На якой стадыі гаспадарча-культурнага развіцця па археалагічнай класіфікацыі знаходзіліся індзейскія плямёны лясной зоны Амерыкі, Каліфорніі, іракезы? Абгрунтуйце свой адказ.

• Якія прылады працы выкарыстоўвалі індзейцы?

• Якое жытло было ўласціва індзейцам Паўночнай Амерыкі?

• Якое адзенне насілі індзейцы? З чаго рабілася замша?

• Якія асаблівасці традыцыйных вераванняў вылучаюць індзейцаў?

• Якімі культурнымі раслінамі Новы Свет адарыў чалавецтва?

• Як перакладаецца слова “іракез”?

• Якая спецыфіка пола-ўзроставага падзелу працы моцна паўплывала на сацыяльную арганізацыю іракезаў і павысіла сацыяльны статус жанчын?

• Раскрыйце змест паняццяў: карыбу, мустанг, наваха, вігвам, катарсіс, талаячэ, візіянізм, потлач.

• Дзе знаходзяцца мураваныя і высечаныя ў скалах жылыя шматпавярховыя комплексы старажытных індзейцаў?



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

• У якіх краінах і ў якой колькасці пражываюць індзейцы сёння?

• Якія заняткі з'яўляюцца больш тыповымі ў сённяшніх паўночнаамерыканскіх індзейцаў?

## ЭТНАСЫ ПАЎДНЁВАЙ АМЕРЫКІ

У Паўднёвай Амерыцы пражывала і зараз пражывае мноства разнародных індзейскіх груп, часцяком вельмі нешматлікіх. Тут налічвалася да пяці тысяч розных плямён, якія размаўлялі адпаведна на пяці тысячах самастойных моў і гаворак. Толькі моўных сямей на гэтым кантыненце налічваецца да сотні.

### 1. ВОГНЕЗЯМЕЛЬЦЫ

На крайнім поўдні Паўднёвай Амерыкі і на астравах Вогненнай Зямлі мясцовыя індзейцы **алакалуфы, она, ямана і ягана** вялі да прыходу еўрапейцаў паўкачавое жыццё прымітыўных рыбаловаў, паляўнічых, збіральнікаў марскіх малюскаў. Яганы былі самымі паўднёвымі жыхарамі свету. Асноўным **заняткам** алакалуфаў і яганаў была рыбная лоўля і паляванне. Жанчыны і дзеці займаліся збіральніцтвам. Прылады працы – гарпуны, лук і стрэлы, кручкі. Іх лодкі крыху нагадвалі венецыянскія гандолы. Выраблялiся яны звычайна з бярозавай кары.

Мужчыны праводзілі ў лодках большую частку жыцця. Склаўся спецыфічны антрапалагічны тып. У мужчын былі адносна кароткія слабыя ногі і добра развітыя рукі, якія увесь час займаліся весляваннем. Незвычайна развілася ўся верхняя частка цела, а ногі не былі заняты з пакалення ў пакаленне, слабелі і ўкарочваліся. У выніку ў сярэднім яганы былі на галаву ніжэйшыя за іншых індзейцаў.

Клімат халодны і вільготны, але людзі да яго прыстасаваліся. Яны прыдумалі унікальнае **адзенне**, якога ў прынцыпе і не было. Яны намазвалі скуру тоўстым слоем цюленевага тлушчу, які не прапускаў вільгаці і захоўваў цяпло. Для прыгажосці ў яго дабаўлялі попел і пераважна чырвоныя фарбы. Зімой да тлушчу дадавалі накідкі з футры. Загартаваныя індзейцы лёгка пераносілі суровы клімат.

**Сацыяльнае жыццё і рэлігійныя вераванні** вогнезямельцаў вельмі нагадваюць культуру эскімосаў. Плямёны дзяліліся на экзагамныя радавыя групы. Лік роднасці вёўся і па жаночай, і па мужчынскай лініях.

У 1870-х гг. еўрапейцы пачалі разводзіць на астравах авечак. Пачаліся сутыкненні з індзейцамі. Жывёлаводы арганізоўвалі на іх сапраўднае паляванне. Тое, што не зрабілі паляўнічыя за індзейскімі галовамі, дарабілі хрысціянскія місіянеры. Яны прымушалі індзейцаў насіць еўрапейскае адзенне. Вільготны клімат пераўтвараў яго ў кампрэс і індзейцы выміралі ад туберкулёзу і прастуды.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## 2. ІНДЗЕЙЦЫ АРАЎКАНІІ

**Араўканія** – краіна незалежных індзейцаў-араўканаў на поўдні і ў цэнтры Чылі. Клімат тут мякчэй, чым на поўначы, дзе знаходзіцца пустыня. Ён у нечым падобны на беларускі.

Мясцовыя індзейцы не пакарыліся інкам. Тыя дайшлі толькі да раёна Сант'яга. Іспанцы пабудавалі фартэцыі, якія па некалькі разоў разбураліся. З 1550 г. адбылося некалькі бітваў. Не заўсёды перамагалі іспанцы. У бітве з індзейцамі загінуў і заснавальнік Чылі Вальдывія. Праз 200 год у пачатку XIX ст. індзейцы ўжо падтрымалі раялістаў і змагаліся за караля супраць патрыётаў-незалежнікаў. Часта нападалі араўканы і на сваіх братоў з-за Кардыльераў. У баі яны распраналіся, зачэсвалі валасы ўверх і дзіка крычалі. Індзейцы адстойвалі сваю самастойнасць да канца XIX ст. Толькі ў 1890-я гг. чылійцы канчаткова падпарадкавалі араўканаў.

**Ігнат Дамейка**, ураджэнец Навагрудчыны, філамат, паўстанец 1830 – 1831 гг., вучоны-мінеролаг, па волі лёсу ў сярэдзіне XIX ст. апынуўся ў Чылі. Прафесар, а пазней і рэктар Сант'яжскага універсітэта (гэтую пасаду ён займаў 16 гадоў) здзейсніў 6 экспедыцый у Анды. У 1844 г. ён наведаў Араўканію і пакінуў каштоўныя і цікавыя апісанні жыцця араўканаў.

**Заняткі.** Індзейцы займаліся паляваннем, збіральніцтвам, земляробствам і жывёлагадоўляй. Каля хаты знаходзіліся грады – невялікія агароды, на якіх расла бульба, кукуруза, бабы, фасоля. Араўканы елі арэхі, якія смажылі, выраблялі з іх муку, збіралі насенне. Нават сваё імя яны атрымалі ад дрэва араўкарыя, якое давала шмат ядомага насення.

**Адзенне.** Хадзілі араўканы басанож, галаву не пакрывалі. Адзенне не кранала ні іголка, ні нажніцы. Жанчыны насілі два тоўстыя (як зімовыя шалі беларускіх паненак у XIX ст.) ваўняныя кавалкі тканіны. Верхняе (**манта**) зашпільвалася на правым плячы і свабодна спадала на грудзі і плечы. Ніжняе (**чыліна**) было тасёмкай прымацавана да таліі і атуляла клубы. Адкрытым было толькі плячо і ногі ніжэй калень. Упрыгожванні былі, як звычайна, шматлікімі: пацеркі, званочкі, каралі, бранзалеты. Мужчыны таксама насілі чыліна, а зверху **пончa** – кавалак матэрыі з выразам пасярэдзіне, праз які прасоўваецца галава чалавека.

Па назіраннях Дамейкі, араўканы былі такімі вольналюбівымі, што не сяліліся вёскамі. Сядзібы стаялі асобна. Чым далей на поўдзень, тым, на яго думку, "халаднейшыя" індзейцы, больш ганарлівыя і спакайнейшыя. Яны не "ўспыхваюць" ад гневу і больш скрытныя, не любяць, калі ім лезуць у душу.

Сур'ёзныя спрэчкі араўканы імкнуліся вырашаць мірна, напрыклад, праз гульню **чуэка**. Два гурты на роўнай каля 1 мілі паляне ганялі драўляную гуму, як для гульні ў кеглі, білі па ёй драўлянай палкай. Спрабавалі загнаць яе за тры лініі абароны. Гульня магла працягвацца 2-3 дні. Пераможца меў перавагу ў спрэчцы.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Араўканскія жанчыны, як і жанчыны іншых плямёнаў, знаходзіліся ў прыніжаным стане. Уся цяжкая хатняя праца, вытворчасць вопраткі, агарод былі на іх плячах. Павадыры маглі мець па некалькі жонак, але мелі часцей адну. Кожнаму кроўнаму жаніх павінен быў даць па 8–12 падарункаў. Кожны падарунак – конь, вол ці аброць. Трэба было плаціць і тады, калі жонка памірала. Пакуль муж не адорваў яе братоў, то яны не давалі пахаваць памерлую.

Абрад **вяселля** цікавы і дзіўны для еўрапейцаў. Паводле апісання Дамейкі, пасля сватання і раздачы падарункаў нявеста і бацькі застаюцца дома. А малады збірае дружыну і, калі яму задумаецца, нападае на дом цесця. Бацька абараняе сваю дачку. Браты пагражаюць. Дзяўчына б'ецца, кусаецца, але яе, знясіленую, забірае жаніх, садзіць на каня, і яны знікаюць у клубах пылу. Дружбакі – за імі. Але дарэмна. Маладыя прападаюць у лясным гушчары. А потым вяртаюцца спакойна дамоў. Жанчын маглі красці і ў суседніх плямёнах.

Жанчыны даглядалі і гадавалі дзяцей. Прывязвалі малых за тулава тканінай да дошчачак. Рукі і ногі пры гэтым заставаліся вольнымі. Пры хадзьбе дошку з дзіцём вешалі за плечы. Калі былі дома, то прыстаўлялі да сцяны, мала зважаючы на енкі і плач дзіця. Маглі дошку з дзіцём павесіць на цвік у сцяне. Калыхалі таксама дзіўна. Ставілі дошку на зямлю вертыкальна і паволі качалі. "Дзіця ківае галоўкай, як жыдок на малітве, – апісваў Дамейка, – аж пакуль не засне."

**Рэлігійныя ўяўленні** да прыходу еўрапейцаў былі тыповымі для індзейскіх народаў. Індзейцы, згодна з апісаннем Дамейкі, верылі ў бессмяротнасць душы і ў будучае жыццё, якое, па іх уяўленнях, стане працягам цяперашняга жыцця. Хваробы індзейцы прыпісваюць чараўніцтву ад зайздрасці. Таму шукалі чараўніцу, якая павінна была адгадаць, хто паслаў хваробу, і, калі можна, адгаварыць. Яны помсцілі ведзьмарам, якія крыўдзяць людзей. Пасля хрысціянізацыі яшчэ доўга яны называлі хрысціяніна інка, а Бога – Вялікі Інка.

**Абрады ўшанавання нябожчыкаў** і ўрачыстае пахаванне таксама ўразілі Дамейку. Нябожчыка апраналі ў самае лепшае адзенне, як на вяселле. Рабілі алкагольнае пітво, рэзалі скаціну. У дзень хаўтуры трубілі трубы. Калі хавалі багатага павадыра, то сотні, а то і тысячы вершнікаў збіраліся каля дома. Труну выносілі ў поле, пыталі нябожчыка, ці жывы ён? А потым скакалі вакол яго, прыпыняючыся толькі для таго, каб выпіць напоі. Часам увесь дзень. Урэшце нябожчыка хавалі і казалі яму, што ўжо пажыў і каб не вяртаўся. У магілу клалі усё, што было патрэбна пры жыцці: адзенне, ежу, воіну – дзіду.

## 3. НАРОДЫ ПАТАГОНІІ

Прыродную вобласць цэнтра Аргенціны часцяком называюць **Патагоніяй.** Тут на поўдні Паўднёвай Амерыкі раскінулася **Пампа** – раўнінныя тэрыторыі з перавагай стэпавай субтрапічнай расліннасці. На тэрыторыі



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

сучасных Аргенціны, Парагвая, часткова Уругвая і Бразіліі калісьці пражывалі разнамоўныя паляўнічыя на гуанака, страусаў і іншую стэпавую дзіч. Тыповая культура была ў плямёнаў **пуэльчэ і тэўэльчэ**.

**Заняткі**. Паляванне на **гуанака** – млекакормячае роду ламаў сямейства вярблюдавых забяспечвала тутэйшыя народы амаль усім неабходным. Вышыня цела ламы 100–130 см, маса 48–96 кг. Для палявання выкарыстоўвалі лук і стрэлы, ласо і асобую прыладу **бола (вола)**. Тры драўляныя або каменныя шары на скураных доўгіх рэмнях кідалі ў ногі ламе, і яны іх апутвалі. Кідаюць той шар, што ў руцэ. **Гуанака** прыпынялася і станавілася бездапаможнай. Мяса ўжывалі ў ежу. Забітую жывёлу індзейцы запякалі, укладаючы ў яе цела гарачыя камяні. Са скуры жывёлы выраблялі адзенне. З нагі ламы, ці каня здымалі скуру, падшывалі знізу і, як панчоху, апраналі на свае ногі. Скурай пакрывалі жытло. Індзейцы качавалі за сваёй здабычай па пампе і вынайшлі пераноснае жытло **тольда** – шацёр з сабачых скур. Мужчыны насілі набедраныя павязкі, жанчыны – фартухі. Зімой апраналі накідкі з футра.

Як і жыхары паўночнаамерыканскіх прэрый, індзейцы пампы атрымалі ад еўрапейцаў новых каштоўных жывёл – коней, кароў і быкоў, якія збягалі ад каланістаў, дзічэлі і станавіліся тутэйшымі "мустангамі" і "бізонамі. Пасля пачатку конегадоўлі ў культуры адбыліся змены, падобныя на змяненні ў Паўночнай Амерыцы, уключаючы і яе мілітарызацыю. Эфектыўнае паляванне прывяло да ўжывання мясной ежы. Таму гэтыя народы былі самымі высокімі ў Амерыцы і аднымі з самых высакарослых ў свеце – больш за 180 см у сярэднім.

**Сацыяльнае жыццё, рэлігійныя вераванні** маюць шмат агульнага з культурай індзейцаў прэрый. Лік роднасці вёўся як па жаночай, так і па мужчынскай лініях. Але галоўныя багацці перадаваліся ў спадчыну па мужчынскай лініі. Конегадоўля моцна паўплывала на сацыяльную структуру і лад жыцця. Культура стала ваяўнічай, а асноўнай адзінкай – група з 30–40 сямей на чале з павадыром. Цяпер яго выбіралі, як правіла, з адной групы сваякоў. Улада павадыра стала амаль спадчыннай. Воіны ўпрыгожвалі сябе пер'ем, пакрывалі твары татуіроўкамі. У баі карысталіся лукам і стрэламі, паліцамі. Назіралася нават паляванне на людзей. Пераможанага воіна скальпіравалі і забівалі. З чарапоў забітых ворагаў рабілі посуд, з бярцовых костачак выраблялі музычныя інструменты.

У XVIII ст. у Патагонію перасялілася частка араўканаў, якіх выцеснілі з Чылі еўрапейцы. У XIX ст. развіццё жывёлагадоўлі ў пампе прывяло да войнаў з індзейцамі, якіх амаль цалкам знішчылі еўрапейскія каланізатары.

## 4. ІНДЗЕЙЦЫ АМАЗОНІІ

У экватарыяльных і трапічных лясах Амазонкі, Арынока, бразільскага нагор'я пражывалі індзейцы розных моўных сямей. Самыя вядомыя з іх – **карыбы** – займаліся паляваннем і збіральніцтвам. Большасць плямёнаў

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

вяло комплексную гаспадарку, у якой важную ролю іграла рыбалоўства, збіральніцтва, трапічнае матычнае земляробства з выпальваннем лясных участкаў, меншую – паляванне. Культывавалі яны пераважна маніёк і маіс. Але лёс тутэйшых індзейцаў вызначаў не лес, а рака Амазонка з мноствам яе прытокаў. Яна была адзінай транспартнай артэрыяй, давала індзейцам рыбу, вадаплаўных птушак, жывёл. Па Амазонцы і яе прытокам індзейцы рухаліся ў лодках, выдзеўбаных або выпаленых з аднаго ствала дрэва. Існуюць і такія плямёны (напрыклад, племя мура на рацэ Мадэйра), якія праводзяць на вадзе ўсё жыццё.

Умовы жыцця былі неспрыяльнымі для палявання. З дзідай або лукам цяжка развярнуцца і эфектыўна паляваць у экватарыяльных лясах. Індзейцы прыдумалі **духавую стрэльбу** – трубку даўжынёй 20–30 см для выдування стрэл, якая дасягала часам і пяціметровай даўжыні. Праз трубку яны выдуваюць кароткую стралу. Забіць ёю нельга, таму яе наканечнік намазваюць атрутай – **курарэ**. Для атруты трэба 40 кампанентаў і некалькі дзён. Гэта атрута нервова-паралітычнага дзеяння. Забівае жывёлу за 5–7 хвілін, але атручвае кавалак мяса не болей за 5 см. Ён выразаўся, а рэшта ўжывалася ў ежу.

Вёскі амазонскіх індзейцаў, як правіла, мелі шэраг пабудоў круглай формы. Сустракаліся і радавыя дамы вялікіх памераў. Даследчыкі выявілі ў некаторых плямёнаў дамы для мужчын, падобныя на мужчынскія дамы Меланезіі і Мікранезіі. У хіжынах тутэйшых індзейцаў мы знаходзім адно з самых знакамітых іх вынаходніцтваў – сеткі для спання (гамакі), якія затым пераняліі ад карэнных жыхароў Амазонкі людзі многіх іншых краін свету. Індзейцы Амазоніі вынайшлі ложак, які ўмяшчаецца ў кішэні. Дзякуючы **гамаку** чалавек знаходзіўся адносна вышэй зямлі, а гэта дазваляла пазбегнуць нападаў дробных драпежнікаў, насякомых. Адзенне тут бытавала самае простае.

**Барора і хівара** – адны з самых вядомых плямёнаў гэтага рэгіёна. Ім быў уласцівы ваяўнічы характар культуры. У племені хівара быў распаўсюджаны звычай здабывання **тсантса (цан-ца)**. У забітага ворага падразалі скуру на шыі і здымалі яе з твару і галавы. Потым скуру запякалі на распаленых камянях. Яна скарачалася да памераў кулака, але захоўвала знешнія рысы былога ўладара скуры. Той, хто валодаў тсантса, валодаў сілай і розумам былога гаспадара.

## 5. СУЧАСНЫЯ ЭТНІЧНЫЯ ПРАЦЭСЫ ПАЎДНЁВАЙ АМЕРЫКІ

Адкрыццё Калумбам Амерыкі сыграла трагічную ролю ў жыцці індзейскіх народаў. Да прыходу еўрапейцаў тут пражывала 20–40 млн чалавек. Пасля кантактаў з прышэльцамі насельніцтва зменшылася ў некалькі разоў, па некаторых падліках – на 90%. Сёння відавочна, што вядучую ролю ў гэтым працэсе сыграла не столькі палітыка еўрапейскіх каланізатараў, а перш-наперш цяжкія



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

хваробы, якія прынеслі белыя перасяленцы. Кантынент абязлюдзеў. Менавіта пагэтаму так адносна лёгка ўдалося падпарадкаваць яго еўрапейцам.

Большасць народаў Лацінскай Амерыкі метыснага паходжання. Іспанскія і партугальскія салдаты з-за адсутнасці еўрапейскіх жанчын бралі ў жонкі і палюбоўніцы індыянак. **Метысы** – нашчадкі ад індзейска-еўрапейскіх шлюбаў – з'яўляюцца асноўнай часткай насельніцтва Венесуэлы, Калумбіі, Парагвая, Эквадора, Чылі і значнай часткай іншых лацінаамерыканскіх краін. Прыкметную долю жыхароў ва ўсіх экватарыяльных краінах і вельмі значную ў Бразіліі складаюць негры і **мулаты** – нашчадкі негрыцянска-еўрапейскіх шлюбаў. У Аргенціне і Уругваі індзейскія народы былі ў свой час знішчаны практычна цалкам. У гэтых краінах пражывае самае еўрапеоіднае насельніцтва Лацінскай Амерыкі – нашчадкі перасяленцаў з розных еўрапейскіх краін. Негроідныя прыкметы ў насельніцтва гэтых краін сустракаюцца крайне рэдка.

У большасці краін рэгіёна аснову раманамоўных этнасаў склала змешанае індзейска-іспанскае, індзейска-афрыканскае, а ў Бразіліі – індзейска-партугальска-афрыканскае паходжанне. Амаль усе этнасы маюць у якасці роднай раманскія мовы еўрапейскіх каланізатараў (іспанскую, партугальскую, французскую) або іх дыялекты. Раманамоўныя народы складаюць большасць насельніцтва краін Паўднёвай Амерыкі за выключэннем Балівіі (63% – індзейцы).

На індзейскіх мовах у пачатку XXI ст. гавораць каля 40 млн чалавек. На 11 буйнейшых мовах карэнных народаў размаўляюць 25 млн чалавек: **кечуа** – 15 млн (Перу, Балівія, Эквадор), аймара – 2,2 млн (Перу, Балівія), гуарані – 3,9 млн (Парагвай), араўканская – 0,9 млн (Чылі). Індзейцы ў Балівіі складаюць большасць насельніцтва, у Перу – трэць, у Эквадоры – чвэрць. Як бачна, перш–наперш змаглі выжыць і прыстасавацца да сучаснай цывілізацыі індзейскія народы, якія яшчэ да прыходу еўрапейцаў дасягнулі ўзроўню цывілізацыі.

Сярод сучасных індзейскіх моў найбольшая – кечуа ("мова горных далін") – належыць да кечуанскіх моў. Да каланізацыі яна была афіцыйнай мовай імперыі інкаў. Сёння на ёй размаўляюць нашчадкі старажытных інкаў. Літаратурны кечуа выкарыстоўвае іспанскі варыянт лацінскага алфавіта, выкладаецца ў школах, але не паўсюдна. Ён шырока выкарыстоўваўся каталіцкімі місіянерамі для хрысціянізацыі індзейцаў. Каля 30% сучасных слоў у кечуа запазычана з іспанскага. Тым не менш многія з тых, хто размаўляе на кечуа, не разумеюць іспанскага.

Тыя індзейскія народы, якія былі на стадыі першабытнага грамадства, як правіла, не маглі супрацьстаяць націску еўрапейскіх каланізатараў. У глухіх раёнах басейна Амазонкі шэраг плямёнаў, праўда, захоўвалі да апошняга часу свой культурна-бытавы ўклад. Але ўжо ў XX ст. знікла 90 плямён індзей-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

цаў Бразіліі. Знікае і асяроддзе іх пражывання. З 1992 г. высечана каля 3 млн гектараў трапічных лясоў. Галоўны драпежнік – японскія кампаніі.

Краіны, у якіх прысутнічаюць значныя масівы індзейскага насельніцтва – Балівія, Парагвай, Перу, Чылі, Эквадор, – з'яўляюцца поліэтнічнымі. Індзейцы ў гэтых краінах дабіліся прызнання сваіх культурных правоў. Разам з іспанскай мова гуарані мае ў Парагваі статус афіцыйнай. Такі самы статус мае мова кечуа ў Перу і Балівіі, у апошняй – разам з аймара.

У некаторых індзейскіх плямёнах Амазоніі захаваліся язычніцкія племянныя культы. Большасць насельніцтва Лацінскай Амерыкі кантынента – каталікі. Трэба адзначыць, што каталіцкія місіянеры ў XVII – XX стст. шмат зрабілі для абароны грамадзянскіх правоў індзейцаў у многіх лацінаамерыканскіх краінах.

У другой палове XX ст. для руху насельніцтва лацінаамерыканскіх краін уласцівы высокі ўзровень унутранай міграцыі. Імкліва расце гарадское насельніцтва, асабліва мегаполісаў. Доля гараджан у многіх краінах адна з самых высокіх у свеце: у Венесуэле – 92%, ва Уругваі – 91%, у Аргенціне і Чылі – 86%.

**Пытанні для самакантролю:**

• Якія індзейскія народы пражывалі на астравах Вогненнай Зямлі?
• Якое унікальнае адзенне прыдумалі індзейцы ямана?
• У чым супадалі і чым адрозніваліся гаспадарчыя заняткі вогнезямельцаў і араўканаў?
• Адкуль узялася імя араўканаў?
• Якое адзенне насілі індзейцы Араўканіі?
• Якія абрадавыя звычаі яскрава адлюстроўваюць менталітэт і традыцыі араўканаў?
• Які даследчык родам з Беларусі пакінуў каштоўныя апісанні жыцця араўканскіх індзейцаў?
• Што такое пампа і Патагонія?
• Якія індзейскія народы пражывалі ў Патагоніі?
• Якія асноўныя індзейскія народы пражываюць ў Амазоніі?
• На якой стадыі гаспадарча-культурнага развіцця знаходзіліся вогнезямельцы, індзейцы Патагоніі і Амазоніі да прыходу еўрапейцаў?
• Якія прылады палявання прыдумалі індзейцы Амазоніі і Патагоніі?
• Хто такія гуанакі?
• На якіх жывёл палявалі індзейцы ў пампе, а на якіх – у трапічных лясах?
• Якія змены пасля пачатку конегадоўлі назіраліся ў культуры індзейцаў Патагоніі?
• Чым адрозніваліся гаспадарчыя заняткі індзейцаў Патагоніі і Амазоніі?
• Па якой лініі вялося радство ў індзейцаў Паўднёвай Амерыкі?

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

• Дзе пражывалі і чым займаліся карыбы?

• Якія сельскагаспадарчыя культуры вырошчвалі плямёны паўднёвай Амерыкі?

• Якія асаблівасці традыцыйных вераванняў вылучаюць індзейцаў?

• Раскрыйце змест паняцця тсантса? Які народ яго здабываў?

• У якіх краінах Паўднёвай Амерыкі і ў якой колькасці пражываюць значныя індзейскія супольнасці сёння?

• Як называюць інкаў сёння?

• Чым адрозніваюцца метысы ад мулатаў?

• У якіх краінах Паўднёвай Амерыкі пражывае найбольшая колькасць мулатаў і неграў?

• Якія індзейскія мовы і ў якіх краінах маюць статус афіцыйных моў?

• У якіх краінах пражывае самае еўрапеоіднае насельніцтва Лацінскай Амерыкі?

## ДАКАЛУМБАВЫЯ ЦЫВІЛІЗАЦЫІ ЦЭНТРАЛЬНАЙ І ПАЎДНЁВАЙ АМЕРЫКІ

Найбольш значнага развіцця ў дакалумбавую эпоху дасягнулі народы Цэнтральнай Амерыкі і Анд. На базе лядна-агнявой у майя, арашальнай у ацтэкаў, а ў інкаў тэраснай сістэмы земляробства склаліся высокаразвітыя цывілізацыі. Яны ведалі пісьменнасць, будавалі гарады, развівалі жывёлагадоўлю і металургію. Тут да прыходу еўрапейцаў узніклі буйныя дзяржавы і існавала арыгінальная высокамастацкая культура, якая была знішчана заваёўнікамі.

Гісторыя і тайны цывілізацый майя, інкаў і ацтэкаў маюць шматлікую літаратуру, добра выкладзены ў даступных студэнтам падручніках і дапаможніках, у сувязі з чым выносяцца на самастойнае вывучэнне.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

Пры вывучэнні тэмы варта звярнуць асаблівую ўвагу на геаграфічную характарыстыку рэгіёна; антрапалагічную характарыстыку яго этнасаў; лінгвістычную сітуацыю; гаспадарку; жыллё і тыпы паселішчаў; адзенне; сацыяльную структуру; палітычную структуру (калі яна існавала); рэлігійныя вераванні; духоўную культуру; сучасныя этнічныя працэсы.

Вельмі важна пры вывучэнні тэмы даваць параўнальную характарыстыку гаспадаркі і звязаных з ёй асаблівасцей матэрыяльнай і духоўнай культуры, рэлігійных уяўленняў этнасаў. Гэта дазваляе ўбачыць эвалюцыю матэрыяльнай і духоўнай культуры народаў свету на ранніх этапах станаўлення культуры сучаснага чалавецтва.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## ТЭМЫ РЭФЕРАТАЎ:

1. Праблема першапачатковага засялення Амерыкі.

2. Гаспадарчая дзейнасць і матэрыяльная культура марскіх паляўнічых і рыбаловаў, паляўнічых і збіральнікаў лясной зоны, збіральнікаў жалудоў, аселых земляробаў, конных паляўнічых Амерыкі (на выбар).

3. Духоўная культура індзейскіх народаў Амерыкі: рэлігійныя ўяўленні, музыка, танцы, фальклор (этнас на выбар).

4. Сацыяльная арганізацыя ў народаў Амерыкі (этнас на выбар).

5. Таямніцы земляробчых цывілізацый майя, ацтэкаў, інкаў (на выбар).

6. Сучаснае становішча эскімосаў, індзейцаў ЗША, Канады, Кечуа (на выбар).

7. Фарміраванне і асаблівасці сучаснай культуры народаў ЗША, англа-канадцаў, франка-канадцаў, этнічных супольнасцей Лацінскай Амерыкі (на выбар).

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# ЛІТАРАТУРА

## Пры падрыхтоўцы да семінарскіх заняткаў і экзаменаў рэкамендуецца выкарыстоўваць наступную літаратуру:

1. *Алексеев, В.П.* География человеческих рас / В.П. Алексеев. – М., 1974.

2. *Арутюнов, С.А.* Народы и культуры: развитие и взаимодействие / С.А. Арутюнов. – М., 1989.

3. *Березкин, Ю.Е.* Инки: Исторический опыт империи / Ю.Е. Березкин. – Л., 1991.

4. *Блейз, А.* История в костюмах: от фараона до денди / А. Блейз. – М.: ОЛМА-ПРЕСС, 2002. – 176 с.

5. *Бромлей, Ю.В.* Современные проблемы этнографии / Ю.В. Бромлей. – М., 1981.

6. *Брук, С.И.* Население мира. Этнодемографический справочник / С.И. Брук. – М., 1986.

7. *Гавриков, Ю.П.* Перу: от инков до наших дней / Ю.П. Гавриков. – М., 1977.

8. *Галич, М.* История доколумбовых цивилизаций / М. Галич: пер. с исп. – М., 1990.

9. География. Энциклопедия: пер. с англ. – М., 1996.

10. *Говард, М.* Сучасная культурная антрапалогія / М. Говард. – Мн., 1995.

11. *Гуляев В.И.* Города-государства майя / В.И. Гуляев. – М., 1979.

12. *Гуляев В.И.* Древние майя: Загадки погибшей цивилизации / В.И. Гуляев. – М., 1983.

13. *Дамейка, І.* Мае падарожжы / І. Дамейка: пер. з пол. мовы і камент. З. Сіцько; прадм. К. Цвіркі. – Мн.: Беларускі кнігазбор, 2002. – 496 с.: іл.

14. *Зубрицкий, Ю.А.* Инки-кечуа: Основные этапы истории народа / Ю.А. Зубрицкий. – М., 1975.

15. Индейцы Америки. Этнографический сборник. Труды института этнографии им. Н.Н. Миклухо-Маклая. Новая серия. – Т. XXV. – М. 1955. – 263 с.

16. Исторические судьбы американских индейцев. – М., 1985.

17. История Перу с древнейших времен до конца XX в. – М., 2000.

18. *Итс, Р.Ф.* Введение в этнографию: учеб. пособие / Р.Ф. Итс. – М., 1990.

19. *Клакхон, К.* Навахо: на английском языке / К. Клакхон, Д. Лейтон. – Cambridge: Harvard, University Press, 1974. – 355 с.

20. *Клод-Катрин Рагаш.* Сотворение мира: пер. с французского / К.К. Рагаш. – М., 1995.

21. *Кнорозов, Ю.В.* Иероглифические рукописи майя / Ю.В. Кнорозов. – Л., 1975.

22. *Кузнецов Ю.Г.* Сладок ли кленовый сок: Современная Канада и ее люди / Ю.Г. Кузнецов. – М., 1988.

23. *Меновщиков, Т.А.* Грамматика языка азиатских эскимосов / Т.А. Меновщиков. – Ч. 1–2. М.; Л., 1962 – 1967.

24. Народы и религии мира. Энцикл. – М., 1999.

25. Народы мира. Этнографические очерки: в 18 т. – М., 1954–1966.

26. Народы мира: историко-этнографический справочник. – М., 1988.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

27. От Аляски до Огненной земли. История и этнография стран Америки. – М.: Наука, 1967. – 372 с.

28. *Рус, А.* Народ майя / А. Рус: пер. с исп. – М., 1986.

29. *Садохин, А.П.* Этнология: учеб. словарь / А.П. Садохин. – М., 2002.

30. Садохин, А.П. Этнология: учебник / А.П. Садохин. – 2-е изд. – М.: Гардарики, 2004. – 287 с.

31. *Садохин, А.П., Грушевицкая, Т.Г.* Этнология / А.П. Садохин, Т.Г. Грушевицкая: учеб. для студентов высших учебных заведений. – М., 2000. – 304 с.

32. *Тишков, В.А., Кошелев, Л.В.* История Канады / В.А. Тишков, Л.В. Кошелев, – М., 1982.

33. *Товадов, Г.Т.* Этнология: учеб. для вузов / Г.Т. Товадов. – М., 2004. – 352 с.

34. *Токарев, С.А.* Истоки зарубежной этнографии / С.А. Токарев. – М., 1978.

35. *Токарев, С.А.* Религия в истории народов мира. – М., 1986.

36. *Токарев, С.А.* Религия народов мира / С.А. Токарев. – М., 1976.

37. *Файнберг Л.А.* Индейцы Бразилии: очерки социальной и этнической истории. – М., 1975.

38. *Чебоксаров, Н.Н., Чебоксарова И.А.* Народы. Расы. Культуры / Н.Н. Чебоксаров, И.А. Чебоксарова. – М., 1985.

39. Черные американцы в истории США. – Т. 1-2. – 1986.

40. Этнические процессы в странах Южной Америки. – М., 1981.

41. Этнические процессы в странах Карибского моря. – М., 1982.

42. Этнографические процессы в современном мире. – М., 1987.

43. Этнография: учебник / Под ред. Ю.В. Бромлея, Г.Е. Маркова. – М., 1982.

44. Этнология / Под ред. В.В. Пименкова, Г.Е. Маркова. – М.,1994.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# СЛОЎНІК ТЭРМІНАЎ, НЕАБХОДНЫХ ДЛЯ ВЫВУЧЭННЯ ТЭМЫ:

**Авачыра** – мацярынская радавая абшчына іракезаў.

**Алакалуфы, она, ямана** – прымітыўныя рыбаловы, паляўнічыя, збіральнікі марскіх малюскаў на крайнім поўдні Паўднёвай Амерыкі і на астравах Вогненнай Зямлі.

**Алганкіны** – індзейскія плямёны, якія з старажытнасці рассяліліся ў раёне Вялікіх азёр, правінцыі Антарыа ў Канадзе, а потым засялілі лясныя раёны Канады і поўнач ЗША.

**Алеуты** – прымітыўныя рыбаловы, якія засялілі Алеуцкі архіпелаг у Ціхім акіяне.

**Амерыканоідная раса** – адгалінаванне вялікай мангалоіднай расы, карэннае насельніцтва Амерыкі (акрамя эскімосаў і алеутаў).

**Апачы** роднасныя індзейскія плямёны, што жывуць у рэзервацыях штатаў Арызона, Аклахома, Новая Мексіка Злучаных Штатаў Амерыкі, адносяцца да паўднёвай групы атапаскаў.

**Араўканія** – краіна незалежных індзейцаў-араўканцаў на поўдні Чылі.

**Атапаскі** – група роднасных па мове індзейскіх плямёнаў, што жывуць уздоўж Ціхага акіяна і Кардыльераў ад Аляскі і Поўначы Канады да Мексікі.

**Бацькоўскі род** – саюз кроўных сваякоў, звязаных роднасцю па лініі бацькі.

**Барора і хівара** – адны з самых вядомых індзейскіх плямёнаў Амазоніі.

**Бола (вола)** – асобая прылада палявання, дзе тры драўляныя або каменныя шары на скураных доўгіх рэмнях кідалі ў ногі ламе, і яны іх апутвалі.

**Вігвам** – купалападобнае жытло, пакрытае скурамі ці карой (нагадвае чум), было вельмі папулярнае ў лясных паляўнічых Канады.

**Візіянізм** (відовішча) – арыгінальная індывідуалістычная рэлігія індзейцаў пома, звязана з абрадам ініцыяцыі, пад час якой тое, што індзеец бачыў пасля ўжывання алкаголю, станавілася яго богам на ўсё астатняе жыццё.

**Гамак** – сетка для спання ў індзейцаў Амазоніі.

**Гаспадарча-культурны тып** – комплекс асаблівасцей гаспадаркі і культуры, які складаецца гістарычна ў розных народаў у падобных геаграфічных умовах.

**Гуанака** – млекакормячае роду ламаў сямейства вярблюдавых, водзіцца ў Патагоніі і Андах. Вышыня цела 100–130 см, маса 48–96 кг.

**Гуарані** – індзейскі народ, які складае большасць насельніцтва Парагвая (3,9 млн). Мова гуарані мае ў Парагваі статус дзяржаўнай.

**Духавая стрэльба** – трубка даўжынёй 20–30 см, праз якую выдуваюць кароткую стралу індзейцы Амазоніі.

**Іглу** – купалападобнае жыллё эскімосаў з снегу.

**Індзейцы** – карэннае насельніцтва Амерыкі (акрамя эскімосаў і алеутаў).

**Ініцыяцыя** – пасвячальныя абрады пераводу юнакоў і дзяўчат ва ўзроставы клас дарослых мужчын і жанчын.

**Інуіты** – саманазва эскімосаў Канады і Грэнландыі.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Іракезская ліга** – канфедэрацыя пяці іракезскіх плямён-нацый, адна з найстарэйшых у свеце дэмакратычных рэспублік, якая дакладна існавала з 1570-х гг. да канца XVIII ст.

**Іракезы** ("народ доўгага дома") – група індзейцаў, якія жылі ў раёне вялікіх амерыканскіх азёраў.

**Карыбу** – амерыканскі паўночны лось.

**Карыбы** – група індзейскіх плямёнаў, якія пражываюць у зоне трапічных лясоў і саваннаў на поўнач ад ракі Амазонкі. У выніку еўрапейскай каланізацыі значная частка вымерла.

**Катарсічная магія** – магія з прымяненнем розных спосабаў ачышчэння арганізма: кровапусканне, ачышчэнне страўніка, паравая лазня.

**Каяк** – паляўнічая лодка эскімосаў, якая нагадвае байдарку.

**Кечуа** (кешуа) – сучасны індзейскі народ агульнай колькасцю каля 15 млн чалавек, які пражывае ў Перу, Балівіі, Эквадоры і іншых краінах Паўднёвай Амерыкі.

**Культ продкаў** – шанаванне памерлых бацькоў і іншых продкаў.

**Культ рэлігійны** – сістэма абрадаў, сродкаў і дзеянняў, накіраваных на абгрунтаванне веры ў звышнатуральнае.

**Курарэ** – атрута нервова-паралітычнага дзеяння з 40 кампанентаў, якую прымянялі пры паляванні з духавой стрэльбы індзейцы Амазоніі.

**Магія** – вера ў здольнасці чалавека звышнатуральным чынам уплываць на натуральны ход падзей, матэрыяльныя прадметы, іншых людзей і прыроду.

**Маіс** – кукуруза.

**Маніту** – Вялікі дух, у якога верылі індзейцы Паўночнай Амерыкі.

**Мацярынскі род** – саюз кроўных сваякоў, звязаных роднасцю па лініі маці.

**Метысы** – нашчадкі індзейска-еўрапейскіх шлюбаў.

**Мулаты** – нашчадкі негрыцянска-еўрапейскіх шлюбаў.

**Мустангі** – здзічэлыя коні прэрый Паўночнай Амерыкі.

**Наваха** – традыцыйны складны жалезны нож індзейцаў, якія пражываюць у Злучаных Штатах Амерыкі.

**Навахі** – роднасныя па мове індзейскія плямёны, якія пражываюць у штатах Арызона, Новая Мексіка, Юта Злучаных Штатаў Амерыкі і адносяцца да паўднёвай групы атапаскаў.

**Нунавут** – аўтаномная тэрыторыя эскімосаў, вылучаная з паўночна-заходніх тэрыторый Канады 1 красавіка 1999 г.

**Пампа** – раўнінныя тэрыторыі поўдня Паўднёвай Амерыкі з пераважаннем стэпавай субтрапічнай раслліннасці.

**Патагонія** – прыродная вобласць поўдня Аргенціны са стэпавай субтрапічнай раслліннасцю.

**Племя** – адна з найбольш старажытных форм этнічнай агульнасці, якая складаецца з радоў.

**Пома** – індзейскі народ, які пражывае ў паўночна-заходняй частцы Цэнтральнай Каліфорніі.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**Потлач** – свята ў аселых рыбаловаў паўночна-заходняга ўзбярэжжа Паўночнай Амерыкі, пад час якога больш заможныя індзейцы частавалі і раздавалі сваю маёмасць суродзічам, што кампенсавалася іх пазнейшымі падарункамі і дапамогай у працы.

**Прэрыя** (лац. – луг) – прыродная падзона лесастэпу ў Паўночнай Амерыцы на тэрыторыі Канады і ЗША.

**Пуэбла** індзейцы, якія пражывалі на мяжы ЗША і Мексікі і на ўрадлівых землях стварылі развітае земляробства са штучным арашэннем палеткаў. Сваю назву тутэйшыя індзейцы атрымалі ад еўрапейцаў па назве сваіх паселішчаў, у якіх дамы мясціліся адзін на адным і тэрасамі падымаліся па схілах пагоркаў.

**Пуэльчэ і тэхуэльчэ** – індзейскія народы Патагоніі.

**Раса** – група людзей, якую аб'ядноўвае агульнасць паходжання і спадчынныя падобныя фізічныя асаблівасці.

**Рэзервацыя** – тэрыторыя, якую адводзяць для пражывання выжыўшых пасля еўрапейскай каланізацыі абарыгенаў, напрыклад, індзейцаў ЗША.

**Седну** – гаспадыня мора ў эскімосаў.

**Скальп** – зрэзаная з галавы чалавека скура з валасамі, ваенны трафей паўночнаамерыканскіх індзейцаў.

**Сонечныя танцы** – абрадавыя дзеянні індзейцаў Паўночнай Амерыкі, пад час якіх адбываліся рытуальныя ахвярапрынашэнні.

**Талаячэ** – алкагольны напой з кактуса.

**Татэмізм** – вера ў звышнатуральную роднасць паміж групамі людзей і пэўнай жывёлай, радзей раслінай, прадметам ці з'явай прыроды.

**Тольда** – пераноснае жытло ў патагонскіх плямёнаў пуэльчэ і тэўэльчэ, шацёр з сабачых скур.

**Тсантса** – скура твару і галавы забітага ворага, запечаная на паленых камянях, якая скарачалася да памераў кулака, але захоўвала знешнія рысы былога ўладара скуры.

**Хока-сіу** – моўная сям'я індзейскіх плямёнаў, якія пражывалі ад раёна вялікіх амерыканскіх азёраў і да Карыбскага мора.

**Чум** – руская назва пераноснага конусападобнага жылля, якое пакрывалася скурамі, карой, войлакам.

**Чуэка** – гульня араўканцаў, у якой два гурты на роўнай каля 1 мілі паляне ганялі драўлянымі палкамі драўляную гуму, як для гульні ў кеглі, і спрабавалі загнаць яе за тры лініі абароны. Пераможца меў перавагу ў спрэчцы.

**Шаманства** – ранняя форма рэлігіі, заснаваная на веры ў зносіны шамана, які знаходзіцца ў стадыі рытуальнага экстазу, з духамі і здольнасць прадказваць будучыню, лячыць ад хвароб і г.д.

**Шаман** (тунгускае слова) – служка культу, вядзьмар, які здольны ўводзіць сябе ў стан экстазу, спецыяліст па сувязі са звышнатуральным светам.

**Эскімосы** – этнічная супольнасць, якая пражывае ад усходняй Чукоткі Расійскай Федэрацыі і Аляскі ўздоўж арктычнага ўзбярэжжа Канады да Грэнландыі.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## ЗМЕСТ

ПРАДМОВА........................................................................ 3

ГЕАГРАФІЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА
І ГІСТОРЫЯ ЗАСЯЛЕННЯ АМЕРЫКІ.......................................... 4

АРКТЫЧНЫЯ ПАЛЯЎНІЧЫЯ І РЫБАЛОВЫ................................. 5

ІНДЗЕЙЦЫ ПАЎНОЧНАЙ АМЕРЫКІ.......................................... 10

1. Паляўнічыя і збіральнікі лясной зоны................................ 10
2. Збіральнікі і паляўнічыя Каліфорніі................................... 13
3. Паляўнічыя прэрый........................................................... 14
4. Ручныя земляробы............................................................ 16
5. Сучасныя этнічныя працэсы Паўночнай Амерыкі.............. 18

ЭТНАСЫ ПАЎДНЁВАЙ АМЕРЫКІ.............................................. 21

1. Вогнезямельцы.................................................................. 21
2. Індзейцы Араўканіі............................................................ 22
3. Народы Патагоніі.............................................................. 23
4. Індзейцы Амазоніі............................................................. 24
5. Сучасныя этнічныя працэсы Паўднёвай Амерыкі.............. 25

ДАКАЛУМБАВЫЯ ЦЫВІЛІЗАЦЫІ ЦЭНТРАЛЬНАЙ
І ПАЎДНЁВАЙ АМЕРЫКІ.......................................................28

ЗАКЛЮЧЭННЕ.........................................................................28

ТЭМЫ РЭФЕРАТАЎ................................................................29

ЛІТАРАТУРА...........................................................................30

СЛОЎНІК ТЭРМІНАЎ, НЕАБХОДНЫХ ДЛЯ ВЫВУЧЭННЯ ТЭМЫ.........32

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Вучэбнае выданне

**Агееў** Аляксандр Рыгоравіч

# ТРАДЫЦЫЙНАЯ КУЛЬТУРА НАРОДАЎ АМЕРЫКІ

Метадычныя рэкамендацыі
для студэнтаў 1 курса гістарычнага факультэта

Тэхнічны рэдактар *Г.М. Гладун*
Камп'ютэрная вёрстка *У.Э. Кавалеўскі*
Карэктар *Г.В. Цецерукова*

Падпісана ў друк 12.05.08.
Фармат 60x84/16. Гарнітура Franklin Gothic Book.
Ум.-друк. арк. 2,1. Ул.-выд. арк. 2,5. Тыраж 80 экз. Заказ № 219.

Установа адукацыі "Магілёўскі дзяржаўны універсітэт
імя А.А. Куляшова", 212022, Магілёў, вул. Касманаўтаў, 1
ЛИ № 02330/278 ад 30.04.2004 г.
Надрукавана на рызографе аддзела аператыўнай паліграфіі
УА "МДУ імя А.А. Куляшова"
212022, Магілёў, вул. Касманаўтаў, 1

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова